№№15–16
(2535–2536)

26 студзеня 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

*На прастор, на шырокі разлог*
*Выхадзі, мой народ, грамадою...*
**Якуб КОЛАС**

**Да ўвагі!**

***Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!***

## Наведвайце сайт «Народнай волі»!

Паважаныя чытачы "Народнай волі"!
Знайсці нас у Інтэрнеце можна па адрасе **www.nv-online.info**
Там вы зможаце прачытаць артыкулы апошніх нумароў газеты і абмеркаваць іх, даведацца пра падзеі ў краіне і свеце на стужцы навін, напісаць электронны ліст у рэдакцыю.
Архіў газеты можна паглядзець па адрасе **http://nv.promedia.by**

# Рене ван дер Линден призвал белорусские власти начать диалог с освобождения политических заключенных. И прекращения дискриминации негосударственных СМИ

### Что входит в планы председателя ПАСЕ

Перед отъездом из Беларуси председатель Парламентской ассамблеи Совета Европы **Рене ван дер ЛИНДЕН** встретился с журналистами.

В начале пресс-конференции он сказал: *"Хочу напомнить, что один из столпов, на котором зиждется Совет Европы, — это свобода прессы и право свободно выражать свое мнение".*

Поэтому "Народная воля" спросила: *"Не входит ли в Ваши планы поставить вопрос о том, чтобы белорусская власть прекратила дискриминацию газеты "Народная воля" и других независимых изданий? На наши многочисленные обращения А.Лукашенко вообще не реагирует".*

Поблагодарив за вопрос, ван дер Линден ответил:

— Ситуация в Беларуси не соответствует стандартам Совета Европы в области свободы средств массовой информации. И, без сомнения, эта тема станет важной частью диалога и частью нашего сотрудничества с Беларусью.

В целом проблемы с прессой существуют не только в Беларуси, но и в России, Азербайджане, а также ряде других стран. Единственное, что я могу сказать, — пожалуйста, продолжайте в том же духе, делайте свою работу по совести, таким образом внося свой вклад в развитие страны. Я весьма восхищен действиями правозащитников, храбрых и мужественных журналистов.

Я друг России, но при этом очень жестко отреагировал на убийство журналистки "Новой газеты" Анны Политковской. Недавно я встретился с главным редактором и коллективом "Новой газеты", чтобы открыто выразить солидарность с ними. И я еще раз обращаюсь к руководству России с тем, чтобы были приняты все шаги для расследования этого преступления.

В этом смысле я считаю очень важной работу над докладом о состоянии дел по защите прав человека в Европе. Этот доклад готовится, несмотря на большое сопротивление, которое я испытываю в Совете Европы...

### *О чем еще говорил председатель ПАСЕ?*

#### О своем визите

— Думаю, мне не стоит объяснять, почему я приехал в Беларусь, — сказал председатель ПАСЕ. — Хочу выразить огромную благодарность тем представителям власти, которые организовали мой визит. Они, честно говоря, выполнили все требования, которые я предъявил им до своего визита. Все, кроме одного.

С одной стороны, я хотел встретиться со спикером парламента, а также со многими важными фигурами в политическом мире Беларуси. С другой — хотел познакомиться с гражданским обществом Беларуси, иметь возможность встретиться с представителями оппозиции, со студенчеством. Отмечу, что живая и сильная оппозиция очень важна для развития любой европейской страны. То же самое касается и гражданского общества. Это две равные вещи.

Очень важно, чтобы за каждой политической партией сохранялось право иметь свое мнение, важно, чтобы партии играли активную роль в жизни страны. То же самое могу сказать и в отношении неправительственных организаций. В моем представлении они должны являться неотъемлемой частью политической жизни.

Для меня было не очень просто организовать этот визит. В самом начале я испытал большое сопротивление и услышал много критики. Тем не менее я принял решение приехать сюда. Мы должны говорить друг с другом и начинать диалог. Но также я ожидаю, что внутри Беларуси в качестве ответа на мой визит будут предприняты определенные политические шаги. Мы готовы предоставить необходимое содействие. Например, в той части, которая касается избирательного законодательства и практики наблюдения за выборами...

#### О встрече с Лукашенко

— Я не исключаю возможности встречи с президентом Беларуси в случае определенных позитивных шагов в ходе дальнейшего диалога.

#### О политзаключенных

— Я не знаю в деталях, как принимаются решения в Беларуси. Но в ходе всех своих встреч я видел желание и готовность к тому, чтобы сделать конкретные шаги. И какими бы ни были эти шаги, среди них обязательно должно быть освобождение политических заключенных. И лично я не делаю выводов по поводу того, является ли кто-либо политзаключенным или нет. Для этого у нас есть чрезвычайно опытные международные эксперты, объективные и нейтральные в своих суждениях...

#### О громких исчезновениях

— Конечно же, я разговаривал с господином Коноплевым и другими об исчезновении Захаренко, Гончара, Красовского и Завадского. Я в Беларуси для того, чтобы вести откровенный, открытый и прямой диалог, без всякого намерения манипулирования фактами и суждениями. Я абсолютно нейтрален, и для меня этот вопрос не представляет какой-либо персональной важности. Я понимаю, что мы сейчас не можем говорить о смене направлений, о смене ценностей. Невозможно страну и общество изменить за одну ночь. Необходимо больше терпения. Пока мы можем говорить лишь о скорости движения в этом направлении...

#### О Козулине

— Я запросил встречу с господином Козулиным. Это было невозможно. Но мы нашли выход из этой ситуации, что для меня приемлемо, — я разговаривал с его супругой. Думаю, эта встреча является важной и для Козулина, и для других политзаключенных. Я убежден, что должна быть озабоченность и забота всех, чтобы его здоровье было в хорошем состоянии... Я попросил посла Германии нанести визит г-ну Козулину и попросил спикера парламента оказать содействие в этом вопросе.

#### О невыполненных условиях ПАСЕ

— Все условия по моему визиту были выполнены. Я здесь не для того, чтобы вести переговоры о выполнении всех 12 условий, пункт за пунктом, выставленных европейским сообществом. Я здесь для того, чтобы продемонстрировать готовность к диалогу. Что касается резолюции ПАСЕ, то очевидно, что есть целый ряд критических моментов, о которых я уже говорил. И на всех своих встречах я говорил об этом. Но их выполнение — это пошаговый процесс.

#### О ценностях

— У меня такое ощущение, что после разногласий с Россией у белорусской стороны появилось больше готовности для сотрудничества с европейскими структурами, и поэтому я призываю к открытому диалогу.

Беларусь — единственная страна, которая не является членом паневропейской семьи. И поэтому необходимо принять те ценности, которые разделяют все члены европейской семьи. Давайте начнем с освобождения политических заключенных. И если есть разногласия по поводу того, есть в Беларуси политические заключенные или нет, то давайте попросим международных экспертов определить. И давайте примем их заключения и выводы...

**Марина КОКТЫШ.**

**ОСТРЫЙ ВЗГЛЯД**

### *Андрей САННИКОВ, бывший заместитель министра иностранных дел Республики Беларусь:* ***«Любое послабление со стороны международных организаций ведет к усилению репрессий»***

— Ван дер Линден так настойчиво добивался приезда в Беларусь, что сложилось впечатление, что он кому-то пообещал обязательно это сделать, — такое мнение высказал Санников в интервью сайту "Хартии'97". — Возможно, своим друзьям из российской Думы. Председатель ПАСЕ сознательно пошел на нарушение решений и политики этой авторитетной европейской организации и тем самым ослабил консолидированную политику депутатов ПАСЕ в отношении Беларуси. Его визит можно рассматривать как очередную неуклюжую попытку обеспечить хоть какое-то международное признание диктаторскому режиму. Почему ван дер Линден проявляет такую личную заинтересованность в поддержке нелегитимных "палаточников", можно только догадываться. Надеюсь, что такой самовольный визит руководителя ПАСЕ получит соответствующую оценку европейских парламентариев. Поскольку даже высшее должностное лицо международной организации не имеет права действовать вопреки решениям этой организации. Можно вспомнить другого чиновника ПАСЕ, бывшего спецдокладчика по Беларуси — Азима Молла-заде, приезда которого также настойчиво добивались белорусские чиновники. Г-н Молла-заде поставил условие своего приезда — освобождение политзаключенных, но поскольку этого не произошло, от поездки в Беларусь он отказался. Видимо, у ван дер Линдена иное понятие о принципиальности. Безусловно, этот визит никак нельзя рассматривать как поддержку демократических сил и демократических процессов в Беларуси. Мы очень хорошо знаем, что любое послабление со стороны международных организаций и демократических государств ведет к усилению репрессий, к ухудшению отношения к политзаключенным и развязывает руки режиму. Думаю, что даже ван дер Линден в очередной раз убедился в отсутствии возможности для диалога с "депутатами" и другими чиновниками, которые в нашей ситуации ничего не решают.

*(Продолжение темы на 2-й стр.)*

## *Будынак генконсульства Эстоніі аблілі чорнай фарбай*

У ноч з панядзелка на аўторак невядомыя хуліганы аблілі чорнай фарбай будынак, у якім месціцца генеральнае консульства Эстоніі ў Мінску. На тэрыторыю генконсульства таксама былі закінуты ўлёткі з заклікамі адмовіцца ад зносу помнікаў савецкім салдатам.

На месцы здарэння працавалі супрацоўнікі Савецкага аддзялення міліцыі Мінска, але на момант здачы гэтага нумара ў друк злачынцы-дзікуны не былі выяўлены.

Дарэчы, у будынку па вуліцы Дарашэвіча разам з генконсульствам Эстоніі месціцца таксама амбасада Латвіі. Аднак пашкоджана толькі тая частка будынка, якая належыць прадстаўніцтву афіцыйнага Таліна.

**Ул.інф.**

**ЧУЛІ?**

## *Ці пойдзе нафта з Вентспілса ў Наваполацк?*

Урад Беларусі вывучае пытанне, звязанае з магчымасцю паставак нафты на беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы з балтыйскіх партоў па нафтаправодзе Вентспілс—Наваполацк, паведаміў у аўторак першы віцэ-прэм'ер урада Уладзімір Сямашка.

Па яго словах, кошт праекта (у тым ліку мадэрнізацыя нафтатрубы) можа скласці ад 15 да 30 мільёнаў долараў. А яго рэалізацыя зойме прыкладна 2,5 года, перадае "Інтэрфакс".

## *В России задержан разыскиваемый Интерполом белорус*

**Сотрудниками центра "Т" МВД России задержан 39-летний гражданин Беларуси Игорь Махнев, находившийся в международном розыске по линии Интерпола и подозреваемый в причастности к похищению гражданина России Вадима Фрейнкмана.**

Как сообщила пресс-служба департамента по борьбе с организованной преступностью и терроризмом МВД РФ, 20-летний Фрейнкман был похищен 18 августа прошлого года в Берлине неизвестными лицами возле своего дома. После этого похитители связались с матерью заложника — профессором психологии и потребовали за освобождение сына выкуп в сумме 500 тысяч евро. Спустя несколько дней сумма выкупа выросла до 670 тысяч евро.

29 августа прошлого года похитителям была передана требуемая сумма, и на следующий день заложник вернулся домой.

Несколько дней назад в центр "Т" МВД России поступила информация, что один из разыскиваемых — Махнев — собирается прибыть в Россию.

Оперативники задержали Махнева в поезде Брест—Москва.

**Олег СНОВ.**

**СКАНДАЛ**

# Студэнт з Гомеля — агент КДБ?

*Днямі 20-гадовы Улад Міхайлаў, які вучыўся ў Польшчы па праграме Каліноўскага, зрабіў сенсацыйнае прызнанне: амаль год ён супрацоўнічаў з беларускімі спецслужбамі.*

У нядзелю ў Інтэрнеце з'явілася ягоная заява.

*"Я доўга думаў над гэтым рашэннем,* — пачынаўся ліст студэнта. — *Гэта было сапраўды няпроста.*

*Такім чынам... Я агент КДБ "Вектар" і вырашыў адмовіцца ад супрацоўніцтва. Фактычна я яго спыніў у лістападзе 2006-га, аднак гэтага сапраўды мала, і я вырашыў гаварыць пра гэта ўслых і прызнаць, што быў завербаваны беларускімі спецслужбамі ў пачатку 2006 года. Гэтаму папярэднічала паўгода кантакту. Гэта час, за які я згубіў веру ў людзей, стаў падазроным, і, безумоўна, гэта адбілася на маім псіхічным стане.*

*Былі пагрозы і шантаж і тэлефанаванні сябрам...*

*Я зараз у Польшчы вучуся па праграме Каліноўскага. Хачу проста забыць аб тым, што было дагэтуль.*

*Я вельмі баяўся. Баяўся быць не зразуметым тут. Спрабаваў знайсці чалавека, які мне дапаможа выбрацца з гэтай ямы. І гэта ўдалося! Я знайшоў чалавека, якому змог цалкам даверыцца. Ён мяне пазнаёміў з журналістам уплывовага польскага выдання "Tygodnik Powszechny".*

Праз дзень "Tygodnik Powszechny" надрукаваў інтэрв'ю з Уладам Міхайлавым.

Хлопец расказаў, што на радзіме яму пагражалі адлічэннем з Гомельскага універсітэта і патрабавалі дзяліцца інфармацыяй пра крыніцы фінансавання дзейнасці гомельскіх недзяржаўных арганізацый. У тыя часы Уладзіслаў супрацоўнічаў з сайтам "StudGomel.com", на якім з'яўляецца незалежная, часам скандальная інфармацыя пра беларускую рэчаіснасць.

Уладзіслаў сцвярджаў, што ў студэнцкую праграму Каліноўскага яго не ўкаранялі беларускія спецслужбы, ён стаў яе ўдзельнікам па сваёй волі — такім чынам хацеў пазбавіцца ад пільнага вока спецслужб. Аднак у Польшчы яму, агенту "Вектару", было даручана перадаваць інфармацыю пра тое, як жывуць студэнты праграмы Каліноўскага.

Але, як напісаў Міхайлаў у сваёй заяве, *"да дзеянняў БТ і іншых правакацый у праграме я не маю ніякага дачынення".*

Заява Улада Міхайлава нарабіла сапраўдны пярэпалах у Польшчы. Аднак дырэктар праграмы Каліноўскага з польскага боку Ян Маліцкі сказаў, што дадзены прэцэдэнт ніякім чынам не паўплывае на далейшую рэалізацыю ўсёй праграмы. "Цяжка ўявіць, — заявіў Маліцкі ў інтэрв'ю Радыё Свабода, — што трэба спыніць праграму з-за таго, што сярод студэнтаў быў агент КДБ".

### Погляд знутры

Пляменнік экс-кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна таксама вучыцца ў Польшчы па праграме Каліноўскага. Пасля падзей 19 сакавіка Саша Казулін, удзельнік намётавага лагера на Кастрычніцкай плошчы, быў вымушаны сысці з 5-га курса юрыдычнага факультэта БДУ. Сёння ён студэнт 2-га курса факультэта права Варшаўскага універсітэта.

— Я, канешне, знаёмы з Уладам Міхайлавым, — кажа Аляксандр Казулін. — Нармальны хлопец, ніколі б не падумаў, што ён супрацоўнічае са спецслужбамі. Але думаю, што ягоная заява — суцэльная праўда. Яшчэ летам, калі мы ўсе разам навучаліся на курсах польскай мовы, прасочвалася розная інфармацыя. І яшчэ тады мы задаваліся пытаннем, адкуль ідзе гэтая інфармацыя. Спрабавалі нават самі нешта высветліць. А калі 21 студзеня з'явілася заява Міхайлава, а потым ягонае інтэрв'ю ў польскай газеце, усё стала на свае месцы.

Што тычыцца асабіста мяне, то мне, канешне, непрыемна было даведацца пра гэты выпадак, але я не асуджаю Уладзіслава. Ён паступіў мужна, што выступіў з такой заявай, не пабаяўся расказаць праўду... Але тое, што амаль год супрацоўнічаў з КДБ... Гэта таксама можна зразумець. Ведаю, што і іншыя студэнты не рабілі катэгарычных высноў.

**Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.**

### ЗВАНОК У КДБ

*Кіраўнік Цэнтра інфармацыі і грамадскіх сувязяў КДБ Валерый Надтачаеў вельмі коратка пракаменціраваў заяву Уладзіслава Міхайлава.*

*— Гэта правакацыя, — заявіў Валерый Мікалаевіч нашай газеце.*

**ТАМ, ЗА КРАТАМІ**

## *Ірына Казуліна трое сутак правядзе з мужам. На жаль, у турме*

**У суботу яна адпраўляецца на спатканне ў віцебскую калонію.**

— На тэрыторыі калоніі ёсць спецыяльны інтэрнат, дзе адбываюцца такія доўгатэрміновыя сустрэчы зняволеных з роднымі, — кажа Ірына Іванаўна. — Маральна я ўжо падрыхтавалася... Павязу з сабою ежу і фотакартки: апошнія здымкі дачок, бацькоў Сашы, унука Уладзіка, якога Аляксандр ужо так даўно не бачыў...

Абавязкова раскажу мужу пра сваю сустрэчу з главой ПАСЕ Рэне ван дэр Ліндэнам, якая адбылася ў мінулую пятніцу.

— Наколькі вядома, адна з умоў візіту ван дэр Ліндэна ў Беларусь тычылася ягонай сустрэчы са зняволеным Казуліным. Еўрачыноўнік сказаў вам, чаму гэтая сустрэча не адбылася?

— Спадар ван дэр Ліндэн падкрэсліў, што гэта была адзіная пазіцыя, якую не выканала беларуская ўлада. Але ён выказаў надзею, што ў хуткім часе наведаць палітвязня Казуліна дазволяць нямецкаму амбасадару Марціну Хекеру. Германія, як вядома, зараз старшынствуе ў Еўрапейскім Саюзе.

Увогуле, па словах кіраўніка ПАСЕ, любая сустрэча чыноўнікаў Еўрапарламента з прадстаўнікамі афіцыйнага Мінска пачынаецца з пытання, калі з беларускіх турмаў будуць вызвалены палітвязні. Не сталі выключэннем і сустрэчы ў Мінску Рэне ван дэр Ліндэна. Ён таксама задаваў гэтае пытанне прадстаўнікам беларускай улады. Беларускія чыноўнікі сцвярджалі, што палітвязняў у нашай краіне няма. А калі старшыня ПАСЕ прапаноўваў правесці незалежную экспертызу, у адказ маўчалі.

Калі казаць пра нейкія вынікі маёй сустрэчы з Рэне ван дэр Ліндэнам, я задаволена. Я ўбачыла, што яго хвалюе лёс майго мужа, што Еўропа зацікаўлена ў тым, каб Беларусь стала па-сапраўднаму дэмакратычнай краінай.

**Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.**

Народная Воля http://www.nv-online.info
26 СТУДЗЕНЯ 2007 г.

ПАЛІТКУХНЯ

## *Валерый ФРАЛОЎ: «Мы маем намер правесці агульнарэспубліканскі рэферэндум...»*

**Некаторыя грамадскія і палітычныя дзеячы вельмі скептычна паставіліся да таго, што былы дэпутат Палаты прадстаўнікоў генерал Валерый ФРАЛОЎ узначаліў Мінскую гарадскую арганізацыю Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада). Асобныя адкрытым тэкстам выказваліся: Фралоў атрымаў неблагі дадатак да генеральскіх пагонаў, але ён для партыі нічога не зробіць. Таму "Народная воля" і пацікавілася ў генерала, як ён наладжвае партыйную справу і чым канкрэтна займаецца.**

— У мяне ўсяго хапае: пенсія — нармальная, дом — ёсць, лазню — будую. Я мог бы ўвогуле палітыкай не займацца! — з імпэтам гаворыць Фралоў. — Тым больш што я ніколі не быў звязаны з партыйнымі справамі. Але мяне пераканаўча папрасілі ўзначаліць Мінскую гарадскую арганізацыю БСДП (Грамада). Я доўга думаў, сумняваўся, бо гэта вельмі складаны кавалак працы: у Мінску ж усе "правадыры" жывуць, кожны шчокі надзімае... А цяпер, шчыра кажучы, задаволены, што пагадзіўся на гэтую працу...

На жаль, асноўная праца многіх нашых партый зводзіцца да таго, каб паведаміць, каго і дзе затрымалі. Адсачыць, хто і што сказаў, пракаменціраваць гэта. Высветліць, хто атрымаў нейкую прэмію і як яе падзяліць.

Я перакананы, што ўсё гэта нецікава простым людзям і — самае галоўнае — увогуле ніяк не адбіваецца на сітуацыі ў краіне. Простаму чалавеку, дый мне самому, падчас даволі складана зразумець, за што змагаюцца асобныя партыйныя лідэры. Думаю, гэта тлумачыць, чаму ў нашай апазіцыі такі малы рэйтынг. Яна варыцца ў нейкім віртуальным свеце!

Для таго, каб людзі паверылі апазіцыі, трэба займацца не балбатнёй, а канкрэтнымі справамі!

Вас цікавіць, чым канкрэтна займаецца мінская гарадская арганізацыя БСДП (Грамада)? Раскажу...

Па-першае, 44 чалавекі ад нас бралі ўдзел у стварэнні Саюза левых партый. Канкрэтнай працы гэты Саюз пакуль яшчэ не распачаў, але мы спадзяёмся, што хутка распачне.

Па-другое, мы бралі ўдзел у палітычнай кампаніі пад назвай мясцовыя выбары. Ад Мінскай гарадской арганізацыі БСДП (Грамада) удзельнічала 24 чалавекі, з іх зарэгістравалі 11, але ў мясцовыя Саветы ніхто не трапіў. Гэта было зразумела з самага пачатку, таму мы проста выкарыстоўвалі гэтую кампанію як магчымасць сустрэцца з людзьмі. Здаецца, гэта незаўважная, руцінная праца — разносіць лістоўкі, хадзіць па кватэрах, размаўляць з людзьмі, але вельмі важная.

"Выбары" прайшлі. Цяпер мы рыхтуемся да Кангрэса дэмакратычных сіл. А яшчэ займаемся ўнутрыпартыйнай працай. На 4 сакавіка прызначаны з'езд нашай партыі. Гэта вельмі важнае мерапрыемства. Напярэдадні трэба падцягнуць усе хвасты, правесці гарадскую канферэнцыю, перад гэтым — раённыя сходы, зрабіць справаздачу ў Мінюст, удакладніць спісы. З аднаго боку — гэта каласальная праца, а з іншага — народу гэта па барабану. Людзей больш цікавіць, хто з кім узяў шлюб, хто развёўся і чаму.

Але ў самай бліжэйшай будучыні, думаю, мы зацікавім КОЖНАГА жыхара Беларусі. Мы маем намер правесці агульнарэспубліканскі рэферэндум, на які вынясем пытанні **аб адмене кантрактнай сістэмы, зменах у Выбарчым заканадаўстве і забароне павышэння платы за камунальныя паслугі да дасягнення сярэдняга заробку па краіне 500 долараў.** Думаю, гэта дасць магчымасць не зваротамі і заявамі, а канкрэтнай справай даказаць, хто на што здольны. Прычым калі раней апазіцыя ўдзельнічала ў тых акцыях, якія абвяшчала ўлада (я маю на ўвазе тыя ж выбары), то цяпер ініцыятыва менавіта за намі.

Мяркую, што падрыхтоўка да правядзення рэферэндуму зойме месяцаў восем, калі не больш. Трэба сабраць подпісы, правесці сход і г.д. Мы будзем рабіць усё па законе. І калі збяром 450 тысяч подпісаў, то ўлада будзе абавязана прызначыць рэферэндум. І прадставіць тэле- і радыёэфір.

Пакуль усю апазіцыю аб'ядноўваюць агульныя ідэі, падыходы, заявы, але яшчэ ні разу не аб'ядноўвала канкрэтная справа. Спадзяюся, што маю ініцыятыву, якую я больш канкрэтна збіраюся выкласці на Кангрэсе, падтрымаюць. Напрыклад, у членаў Мінскай гарадской арганізацыі БСДП (Грамада) вочы ўжо загарэліся, бо гэта не словы, ад якіх усе стаміліся, а канкрэтная справа. Мы будзем з'яўляцца ля прахадных заводаў, фабрык, размаўляць з людзьмі. І я не думаю, што нехта адмовіцца паставіць подпіс за тое, каб не расла "камуналка"...

**Марына КОКТЫШ.**

ТЕМА ДНЯ

*Вячеслав ОРГИШ, доктор философских наук*

# Сигнал к диалогу,

## *или О том, какую медвежью услугу оказал г-н Янчевский Александру Лукашенко*

Разразившийся накануне Нового года белорусско-российский нефтегазовый конфликт политологи, возможно, назовут отправной точкой в экономической и политической модернизации Беларуси. Состоявшийся 18—19 января визит в нашу страну президента Парламентской ассамблеи Совета Европы Рене ван дер Линдена, новейшие высказывания белорусского руководителя, а также общая атмосфера некоторой растерянности и тревоги в поведении белорусских властей наводят на ту же мысль. Чего следует ожидать белорусскому обществу?

### Изоляция не есть будущее

Потребовав от Минска оплаты газа и нефти по рыночным ценам, Москва ясно дала понять белорусскому руководству, что рассматривает белорусско-российскую интеграцию по-лукашенковски как *"паразитирование"* (термин Путина, прозвучавший 21 января во время его сочинской встречи с Ангелой Меркель) и мириться с этим дальше не намерена. Если, конечно, "Красный дом" не собирается выбросить белый флаг и сдаться Кремлю на условиях вступления Беларуси в состав Российской Федерации.

Александр Лукашенко, быть может, впервые за более чем двенадцать лет правления понял, что бесплатный сыр в мышеловке — лакомство опасное, что донорский энтузиазм российских великодержавников иссяк, на его место пришел имперский прагматизм, поэтому пора, выражаясь языком просторечия, "делать ноги". Пора искать стратегическую альтернативу безоглядному братанию с Россией и бесперспективным попыткам реставрации прошлого. Чтобы избежать круговой изоляции, время пробовать развернуть белорусский ковчег в сторону Западной Европы.

Дипломаты и эмиссары официального Минска проявили завидную оперативность и сумели в считанные дни донести до политических элит европейского сообщества новые настроения белорусского руководства. Польская газета "Dziennik" по этому поводу сообщила: *"...Посланники белорусского президента пытаются помириться с Европейским Союзом"*. Запад быстро сообразил, каковы последствия белорусско-российского нефтегазового развода. Судьба дает белорусам еще один шанс усвоить западный вектор геополитического развития. В отличие от ультимативного послания Европы официальному Минску (жесткого и неуклюжего) месячной давности, нынешняя реакция западноевропейцев на белорусскую ситуацию оказалась своевременной и, как представляется, дипломатически удачной.

Ступив на белорусскую землю, президент ПАСЕ Рене ван дер Линден заявил: *"Я надеюсь, что в Беларуси есть понимание того, что изоляция не есть будущее, и собираюсь использовать визит, чтобы содействовать распространению европейских ценностей в Беларуси. Я убежден, что мой визит покажет: диалог лучше, чем изоляция"*.

Во время контактов с представителями белорусской власти Рене ван дер Линден, как кажется, сумел донести до их сознания ряд принципиальных тезисов. В частности, о том, что Запад специально не ищет возможности свести счеты за прошлые ошибки. Да, в Европейском Союзе ждут от Беларуси модернизации в духе общеевропейских экономических и политических стандартов. Но там также понимают, что эта задача непростая, поэтому никто не формулирует вопрос радикально: получить все и сразу. Да, необходимо внести ясность в дело исчезнувших политиков, покончить с дискриминацией независимых СМИ, демократизировать избирательное законодательство, подчеркнул высокопоставленный западный визитер. Однако, как политик, он понимает, что *"невозможно страну изменить за одну ночь"*.

### Встряхнуться и создать новую экономику

Свою миссию Рене ван дер Линден охарактеризовал как "сигнал к диалогу", как желание показать готовность Совета Европы к открытому диалогу на определенных условиях, поэтому дальнейшее развитие отношений между европейским сообществом и Беларусью зависит от действий официального Минска.

В эксклюзивном интервью Первому каналу БТ Президент ПАСЕ высказался еще более определенно и концептуально. *"По моему мнению,* — заявил он, — *в Беларуси уже складывается новая ситуация. Она готова быть более открытой и готова предпринимать конкретные шаги с целью показать ЕС, что она может вести открытый диалог в свете наиболее важных приоритетов Европейского Союза. Эта ситуация сложилась, я думаю, еще до моего приезда. Однако, как вы знаете, в ЕС считают, что Беларусь не поддерживает позицию Совета Европы. Это касается и выборов, и политики президента, и роли оппозиции и гражданского общества. Я отметил все эти моменты во время встреч в качестве одного из предварительных условий для начала открытого диалога..."*

Какой оказалась первоначальная реакция главного чиновника страны на высказывания и предложения Рене ван дер Линдена? Нельзя утверждать, что она была всеобъемлющей и полностью прозрачной. Но она была. И, как кажется, некоторым образом соответствовала пониманию того, что Рене ван дер Линден назвал *"новой ситуацией в Беларуси"*. Посещая дочернее предприятие завода "Атлант" в Шабанах, Александр Лукашенко уже пытался вчерне верстать новую экономическую стратегию. Пока только экономическую. Однако вполне понятно, что ее реализация потребует сдвигов и в сфере политических отношений.

Выступая перед рабочими, белорусский руководитель говорил о том, что надо *"встряхнуться"*. И за три-четыре года создать "совершенно новую экономику", при которой невозможно будет *"жечь сколько угодно"* газа, мазута, солярки и т. д. Все будет просчитано "как во всем мире", прежде всего в Европе. *"Гигантомания закончилась. Нам надо строить компактные, нацеленные в завтра производства"*. Дальше Александр Лукашенко озвучил амбициозный план создания в Беларуси около пятисот новых производств, модернизации нескольких сот действующих.

Иными словами, декларированный Александром Лукашенко отказ от чрезмерно энергоемких производств и промышленной гигантомании означает неизбежность структурных реформ белорусской экономики, дальнейшее ее разгосударствление и приватизацию. Однако это только шаг на пути к новой европейски ориентированной стратегии белорусского экс-интегратора (если таковая, в конце концов, овладеет его умом и волей). Причем шаг, который без помощи извне (европейской помощи), вряд ли получится. Рассчитывать же на такого рода помощь в "Красном доме" могут лишь при соблюдении ряда условий, которые Рене ван дер Линден сформулировал, как уже отмечалось, вполне недвусмысленно. *"Вы также должны принимать во внимание,* — подчеркнул он в интервью Первому каналу БТ, — *что экономика, торговые отношения связаны с правами человека, демократией и верховенством закона... И, если вы хотите видеть эти отношения в ином, лучшем направлении, нам нужно взаимодействовать... И помощь со стороны ЕС для вашей страны обязательно будет"*.

### Бывший комсомолец в роли апологета

Таким образом, если правитель Беларуси, припертый Кремлем к стене, хочет выкрутиться при помощи стратегии сотрудничества с западными странами, ему следует обратить внимание на реформу не только белорусской экономики, но и политических отношений. Необходимо начинать переход от методов авторитарного контроля политической жизни к методам, которые господствуют в Европе, характерны для европейской политической культуры. Надо отказаться от подавления политических противников и учиться конкурентной политике. Для этого придется формировать опорный социальный слой (отнюдь не социальных аутсайдеров), создавать политическую организацию (партию), которая, используя демократические процедуры, сможет отражать атаки политических конкурентов и контролировать политическое пространство страны.

Готов ли к такому сценарию Александр Лукашенко, однозначно ответить трудно. Зато нетрудно заключить, что значительная (возможно, большая) часть его окружения, воспитанная им в духе потребностей авторитарного режима, совершенно не готова действовать в русле европейских политических ценностей, поэтому будет всячески тащить "вождя" назад, всеми способами обосновывать необходимость хранить верность идеалам автократии. Как это делает, например, первый заместитель директора Информационно-аналитического центра Администрации президента некто г-н Янчевский. *"Я не стану говорить, что у нас классическая европейская демократия. Конечно, ее нет. И очень хорошо! Нам она пока никак не подходит. У нас,* — согласно глубокомысленному выводу бывшего комсомольского вожака, — *в чистом виде авторитаризм. И исторически для нас — это самая лучшая система"*.

Конечно, некоторое время назад, когда о новой политической стратегии никто не заикался, подобного рода высказывание было бы очень даже в строку. Но сегодня, когда Александр Григорьевич пытается стучаться в европейские ворота, когда президент ПАСЕ подает сигнал к диалогу, подобного рода высказывания воспринимаются, по меньшей мере, как медвежья услуга. Мой знакомый мастер по металлу Вацлав, прочитав цитату ретивого чиновника, счел уместным вспомнить пословицу о том, что... услужливый дурак — опаснее врага.

***

Так все-таки, принимая во внимание экономические и политические пертурбации последнего времени, визит Рене ван дер Линдена в Минск, поданные им сигналы, стоит ли белорусскому обществу надеяться на то, что Александр Лукашенко выберет новую стратегию развития Беларуси, которая поведет ее по пути европейской модернизации?

Не будем спешить с окончательными выводами. Нельзя исключить того, что западная активизация официального Минска продиктована, главным образом, его намерением, так сказать, пострашать кремлевских стратегов: дескать, если не одумаетесь, "единственный союзник" уйдет к другому центру притяжения. Пока несомненно лишь то, что так называемая интеграционная стратегия лопнула и "Красный дом" озабочен поиском новой.

АКТУАЛЬНА

## *Чаму беларусы плацяць за газ больш, чым еўрапейцы?*

*Не паспела Расія падняць цэны на газ, які купляе Беларусь, Савет міністраў тут жа падняў цэны на жыллёва-камунальныя паслугі. Міністр ужо паспеў заявіць, што ў гэтым годзе цэны на паслугі ЖКГ расці больш не будуць. Ці варта верыць падобным абяцанням? І ўвогуле, якім чынам фарміруецца цана на тую ж цеплавую энергію? Хадзілі чуткі, што за цеплавую энергію мы плацім ужо больш, чым многія еўрапейскія краіны? Ці так гэта?*

**Валянціна СІДАРЭВІЧ, Мінск.**

Беларуска-расійская нафтагазавая вайна не магла не адбіцца на беларускай эканоміцы. Рост цэн на газ выклікаў з 1 студзеня 2007 года і павелічэнне тарыфаў на паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Тарыфы на газ і электрычнасць сягнулі ўвысь на 20%, на цеплавую электраэнергію — на 12%.

*"Прынята рашэнне пра тое, што мэтазгодна 5 долараў аддаць на павышэнне тарыфаў на газ, электрычную энергію і цеплавую энергію, бо менавіта гэтыя рэсурсы падаражалі на ўваходзе ў краіну"*, — заявіў міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі **Уладзімір БЕЛАХВОСТАЎ.** І сёлета, абяцаў чыноўнік, аплата жыллёва-камунальных паслуг расці больш не будзе.

Кіраўнік аналітычнага цэнтра "Стратэгія" **Леанід ЗАІКА** перакананы ў адваротным: *"І да росту цэн на газ мы плацілі за цеплавую электраэнергію па еўрапейскіх расцэнках, цяпер мы атрымалі супереўрапейскія цэны"*.

Нягледзячы на тое, што да нядаўняга часу мы куплялі газ па ўнутрырасійскіх цэнах, простым спажыўцам ён каштаваў значна даражэй. Больш за тое, нам ён каштаваў нават болей, чым спажыўцам у Еўрасаюзе.

Па-першае, у Еўропе газ мераюць не кубаметрамі, а па гігакалорыях. Летась (у 2006 годзе) адна гігакалорыя ў краінах Еўрапейскага Саюза ў сярэднім каштавала 9,93 еўра: у Германіі — 12,25 еўра, Эстоніі — 3,93 еўра, Літве — 5,29 еўра, Партугаліі — 13,83 еўра, Швецыі — 14,80 еўра, Румыніі — 4,64 еўра.

Што мае Беларусь? За снежань 2006 года я атрымаў жыроўку, у якой цана адной гігакалорыі раўняецца 32.460 рублёў, ці 11,60 еўра (15,16 долара). Параўнальныя кошты маюць, напрыклад, Галандыя (11,09 еўра) і Іспанія (11,75 еўра), але там у людзей даходы не параўнаеш з нашымі.

Дорага каштуе нам газ. Вельмі дорага! А цяпер трэба адказаць на пытанне: чаму дорага?

Неэфектыўная жыллёва-камунальная гаспадарка, старыя трубы, дрэнная цеплаізаляцыя, велізарнае расходаванне энергіі ўпустую, зношаная інфраструктура ЖКГ — усё гэта і ёсць прычына, чаму мы плацім па еўрапейскіх цэнах за цеплавую энергію.

Аб'яўленае з 1 студзеня павышэнне цэн — адміністрацыйнае павышэнне, якое не мае нічога агульнага з рыначнымі цэнамі. Расія ў два разы падняла цану на газ. Значыць, за цеплавую энергію адпаведна мы таксама будзем плаціць удвая больш: замест 32 тысяч — 64—65 тысяч рублёў за гігакалорыю. Да павышэння цэн на газ мы плацілі па еўрапейскіх коштах, пасля павышэння ў два разы атрымалі супереўрапейскія цэны. Калі міністр заяўляе, што сёлета павышэнне больш не будзе — значыць, грошы будуць браць з іншай кішэні: знізяцца заробкі, павысяцца цэны і гэтак далей. Прычым не прадпрыемствы, а мы, 9.750.000 шараговых жыхароў краіны, будзем плаціць. Трэба нагадаць міністру пра закон захавання энергіі, які адкрыў яшчэ Мендзялееў.

Калі такое гаворыць міністр, варта задацца пытаннем: а ці трэба нам такі міністр, ці трэба нам такое Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі? Калі сур'ёзна, то трэба праводзіць парламенцкія слуханні і даваць рэальную ацэнку стану энергетыкі краіны.

92—95% усяго газу спажываюць прадпрыемствы. Але ёсць сегмент у 5—8% — гэта мы з вамі, кожны беларус. І кожны беларус мусіць ведаць, за што ён плаціць грошы. Калі жыллёва-камунальная гаспадарка ні на што не здатная, то, можа, нам трэба пайсці шляхам Калінінградскай вобласці? Там у кожнай кватэры стаяць газавыя катлы, цяпер робяць ужо навясныя, якія абсталяваны датчыкамі знешняй і ўнутранай тэмператур. Міні-камп'ютэр рэгулюе тэмпературу якраз паміж знешняй і ўнутранай. І не патрэбны ніякія міністэрствы...

А так мы апынуліся на парозе новага вітка энергазбераження, якое, баюся, хутка звядзе энергаспажыванне да нуля: будзем баяцца ўключыць святло ў кватэры.

**Георгій ГЛЕБУСЬ.**

ПРАГНОЗ

*Іван ВАЛАДЗЬКО, намеснік дырэктара Цэнтральнага батанічнага саду:*

## «У батанікаў няма падстаў для хваляванняў...»

Знаёмыя з дзяцінства прыкметы пор года гэтай зімой амаль не дзейнічалі — толькі апошнімі днямі плюсавая тэмпература змянілася на мінусавую, а на зялёнай траве з'явіўся снег. Тэма глабальнага пацяплення клімату ва ўсіх на вуснах. У рэдакцыю тэлефануюць шматлікія чытачы з простым пытаннем: "Што будзе з будучым ураджаем? Як расліны адрэагуюць на такія нязвыклыя ўмовы надвор'я?"

Па тлумачэнні мы звярнуліся да намесніка дырэктара па навуковай працы Цэнтральнага батанічнага саду Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, кандыдата біялагічных навук **Івана ВАЛАДЗЬКО.**

**— Іван Казіміравіч, з пункту гледжання спецыяліста, што зараз адбываецца з раслінным светам Беларусі? Ці не зменіцца вясной звыклы нам пейзаж?**

— Пакуль нічога небяспечнага для раслін не назіраецца. Тэмпература была працяглы час плюсавая, але гэтага яшчэ недастаткова для актыўнай вегетацыі. Дрэвы і кусты зараз у стане спакою, і негатыўна на іх нішто асабліва не ўплывае. А вось хвоям, якія і зараз "не спяць", трэба было б сонца паболей. Сонечны свет дапамагае ім назапасіць неабходных рэчываў і больш трывала перачакаць непагадзь.

Што дрэннага для флоры ў адносна цёплай зіме? У Заходняй Еўропе заўсёды зімы прыкладна такія, і што? Ад гэтага ж расліны там не перасталі пладаносіць. І мае калегі-аграрыі пацвердзяць, што стан азімых па краіне зараз здавальняючы — пасевы, якія не кранулі лістападаўскія замаразкі, адчуваюць сябе зусім нядрэнна.

**— Але зіма пакуль не скончылася. Урэшце прыйшло да нас пахаладанне, ды і месяц люты яшчэ можа поўнасцю апраўдаць сваю назву і нагнаць тое, што ўпусцілі снежань і студзень...**

— На самай справе, надалей сцэнарыяў развіцця падзей два: сапраўдная зіма або, нарэшце, прыйдзе да нас, або не.

Калі тэмпература будзе апускацца пакрысе, павольна замерзне зямля і раслінны свет проста засне (не так і важна, ці надоўга). Каб вымерзлі цяперашнія пупышкі і парасткі, трэба маразы градусаў пад 20.

Калі халодныя арктычныя масы абмінуць нас сёлета, то з павышэннем тэмператур расліны пачнуць нармальны працэс вегетацыі. Дарэчы, зараз іх стан адпавядае прыкладна сярэдзіне—канцу сакавіка. Таму батанікі бачаць небяспеку толькі ў раптоўных вялікіх маразах, а таксама ў тым, што на няўмерзлую глебу ляжа значная колькасць снегу (ад гэтага расліны проста сапрэюць). У астатнім жа прагнозы спрыяльныя.

**— Іван Казіміравіч, не трэба быць вялікім спецыялістам, каб заўважыць, што апошнім часам расліны вакол нас мяняюцца — трава і зараз зялёная, які год запар не ў час цвітуць каштаны. Ці не сведчанне гэта глабальнага пацяплення?**

— На тое, што мы бачым пэўныя змены ў расліннасці сталіцы, ёсць тлумачэнні не толькі з боку змены кліматычных умоў. Напрыклад, трава зараз зялёная таму, што гарадскія газоны засяваюць насеннем асаблівай селекцыі — гэтая трава больш устойлівая і амаль не мяняе свайго колеру. Дарэчы, практычна ўсё тое, што выкарыстоўваецца зараз для азелянення гарадоў — гэта расліны іншаземныя, нашы спецыялісты працуюць над тым, каб яны былі больш прыстасаванымі да няпростых умоў вялікага горада. А каштаны ўздоўж праспектаў зацвітаюць не ў тэрміны, бо яны дасягнулі таго ўзросту, калі дрэва гатова актыўна даваць патомства.

Што сапраўды выклікае занепакоенасць і на самай справе сведчыць пра тэндэнцыі пацяплення, дык гэта стан нашых ельнікаў — дрэўцы сталі горш расці, хварэюць, робяцца кволымі. Паўднёвая мяжа росту ельнікаў праходзіць прыкладна па поўдні Беларусі, а зараз яна адыходзіць усё далей на поўнач. На месца елак у нашых лясах прыходзяць бярозы ды асіны.

**— Калі падвесці вынік, то, на Вашу думку, ці не стане сёлетняя зіма ўдарам па харчовай бяспецы нашай краіны?**

— Для ўраджаяў куды большае значэнне мае тое, якімі будуць вясна і лета. Тут, як у народзе кажуць, не хваліся, ды Богу маліся. А мы, навукоўцы, у цёплай зіме бачым пэўныя станоўчыя моманты. Батанічны сад займаецца селекцыяй замежных журавін, буякоў, абляпіхі, глогу, каб іх вырошчваць у прамысловых маштабах, а не збіраць па балотах. У больш мяккім клімаце гэтыя расліны сталі прыжывацца куды лепей.

А яшчэ гэтай зімой нам намнога лягчэй даглядаць за аранжарэямі. Наш асаблівы гонар — новы павільён, у якім мы зможам прымаць наведвальнікаў. Хто ведае, якімі тэмпамі пойдзе глабальнае пацяпленне, а мы ўжо зараз зможам паказаць нашым суайчыннікам трапічную і субтрапічную расліннасць.

**Таццяна ПАЎЛІКАВА.**

ЦЭНЫ

## *Бяроза — такі ж дарагі горад, як і Мінск. Чаму?*

Сярэдняя цана па краіне на ялавічыну першай катэгорыі на канец снежня 2006 года складала 7168 рублёў і вагалася ад 5390 да 6600 у Пінску, Баранавічах, Століне, Лідзе, Барысаве да 7370—9000 у Віцебску, Мазыры, Гродне, Магілёве, Бабруйску. Пра гэта афіцыйна паведаміла Міністэрства статыстыкі. Розніца, пагадзіцеся, істотная. Як, дарэчы, і ў цэнах на свініну. Калі ў Верхнядзвінску, Рагачове, Ваўкавыску, Шчучыне, Чавусах кілаграм можна было набыць за 6550—6890 рублёў, то ў Бярозе, Жыткавічах, Беразіне, Бабруйску, Горках — па 7950—9000 рублёў за кілаграм.

Самыя нізкія цэны на свежую капусту ў снежні мінулага года былі ў Століне, Гомелі, Горках, Клімавічах, Чавусах і склалі 330—390 рублёў пры сярэдняй цане на яе ў краіне 513 рублёў. Самая танная цыбуля была ў Століне, Гомелі, Мазыры, Жыткавічах, Ваўкавыску, Барысаве, дзе яе можна было набыць па 840—990 рублёў за кілаграм. Самыя нізкія цэны на бульбу зафіксаваны ў Пінску, Стоўбцах, Горках, Клімавічах і Чавусах (500—540 рублёў).

Нагадаем, параўнальны аналіз цэн штомесяц праводзіцца на прадпрыемствах гандлю ўсіх форм уласнасці, афіцыйных і нефармальных рынках у 31 горадзе краіны. Па яго выніках, самыя нізкія цэны на асноўныя прадукты харчавання ў снежні мінулага года былі ў Пінску, Століне, Гомелі, Чавусах і Горках, а самыя высокія — у Беразіне, Бярозе, Мазыры, Віцебску, Оршы, Бабруйску і Мінску.

**Лілія ВОРАНАВА.**

Народная Воля http://www.nv-online.info
26 СТУДЗЕНЯ 2007 г.

НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ!

# Разгул цемрашальства мацнее

Адзін за адным працягваюцца ў краіне пагромы беларускай культуры, беларускай духоўнасці, беларускай мовы, літаратуры, мастацтва, беларускага свабоднага слова. Дазвольце сёе-тое нагадаць: "родная ўлада" разграміла Саюз беларускіх пісьменнікаў, адабрала ў яго ўласную сядзібу — Дом літаратара і літфондаўскую паліклініку (ні ў адной былой рэспубліцы СССР гэтага не зрабілі), зацягала пісьменнікаў па судах, адабрала ў СБП часопісы "Полымя", "Маладосць", "Нёман", газету "Літаратура і мастацтва"; выкінула на вуліцу Беларускі нацыянальны ліцэй імя Я.Коласа і г.д., і г.д., і г.д. І вось — чарговы пагром. На гэты раз — гвалт над часопісам "Роднае слова" — самым любімым часопісам беларускіх настаўнікаў, выкладчыкаў мовы і літаратуры. Зняты з пасады яго галоўны рэдактар, нястомны руплівец на ніве асветы Міхась Шавыркін. Дзевятнаццаць гадоў — ад першага нумара і дагэтуль — ён выдатна вёў, трымаў на належным прафесійным узроўні гэтае выданне. Але яго прафесіяналізм, яго бездакорны мастацкі густ, яго чалавечая сумленнасць, яго грамадзянская адказнасць перад настаўніцтвам Беларусі, перад справай адукацыі і выхавання моладзі, — кагосьці не задавальняюць, ды так, што аж трэба ўчыніць гвалт. Натуральна спытаць: каго менавіта не задавальняюць? Міністра адукацыі? Але — чаму? Што не падабаецца? Якія канкрэтна мастацкія творы, дыдактычныя матэрыялы і метадычныя распрацоўкі? Можа быць, настаўнікі выказалі сваё незадавальненне? Нічога падобнага. Усё — цалкам наадварот.

І аднак жа пагром адбыўся. І запрацавала цэнзура. З апошняга нумара часопіса знялі партрэты паэта Алеся Звонака і драматурга Кастуся Губарэвіча, 100-годдзе з дня нараджэння якіх "Роднае слова" рашыла адзначыць. Я хачу спытаць у шаноўнага міністра і ў іншых "адказных": чым вам не падабаюцца лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Алесь Звонак і лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, заслужаны дзеяч культуры БССР Кастусь Губарэвіч? Якія прэтэнзіі паявіліся да іх, на жаль, даўно нябожчыкаў? Не падабаюцца вершы паэта пра Радзіму? Ці п'есы драматурга пра абарону Брэсцкай крэпасці? Ну трэба ж нейкае патлумачэнне даць!

Але хто і што можа патлумачыць там, дзе ўвогуле нішто не падлягае здароваму сэнсу і элементарнай чалавечай логіцы. Там, дзе на вялікую і адкрытую душу народа насунулася хмара-бяда. Уражанне такое, што з прадонняў быцця падняліся самыя нядобрыя, самыя чорныя, самыя пачварныя сатанінскія сілы, — падняліся, каб перамагчы, задушыць і растаптаць усё здаровае, чыстае, светлае, чым імкнецца жыць і павінен жыць народ, яго літаратура і мастацтва. Пры гэтым з усіх экранаў энергічныя крыкуны крычаць пра духоўнае адраджэнне, пра дзяржаўны клопат аб нацыянальнай літаратуры, пра поспехі і дасягненні.

Аказваецца, пагром "Роднага слова" — гэта клопат аб нацыянальнай літаратуры і духоўным адраджэнні беларускага народа. Большага цынізму, бадай, нідзе, апрача як у нас, і не сустрэнеш.

Дык думайце, шаноўныя грамадзяне краіны. Думайце і рабіце высновы. Разгул цемрашальства на нашай роднай зямлі мацнее.

**Ніл ГІЛЕВІЧ,**
**народны паэт Беларусі,**
**заслужаны дзеяч навукі,**
**прафесар.**

РЭЙТЫНГ

## *Горш, чым у нас, толькі ў Туркменіі*

Амерыканскі даследчы фонд Heritage Foundation сумесна з The Wall Street Journal рэпрэзентаваў традыцыйны рэйтынг эканамічных свабод. Аналітыкі Фонду ацэньваюць краіны па дзесяці катэгорыях — ад карупцыі і фінансавых свабод да незалежнасці бізнесу ад урада.

Беларусь у гэтым рэйтынгу заняла 145-е месца. У справаздачы адзначаецца: у Беларусі амаль няма фінансавых і інвестыцыйных свабод, нізкі ўзровень правоў на ўласнасць, высокая ступень карумпаванасці чыноўнікаў.

Першае месца ў агульным рэйтынгу заняў Ганконг з паказчыкам 89,3 бала са 100 магчымых. На другім месцы — Сінгапур, на трэцім — Аўстралія. Расія займае 120-ы радок (паміж Кітаем і Непалам у катэгорыі "ў асноўным несвабодныя").

Сярод былых савецкіх рэспублік лепш за ўсіх выглядае Эстонія — 12-е месца, Літва — 22-е месца, Арменія — 32-е. Яшчэ ніжэй за Беларусь аказаўся Туркменістан — ён на 152-м месцы.

**Ул.інф.**

УВАГА!

## *Не званіце ў «03»*

"Згодна з рашэннем дзяржаўнага аператара паслуг тэлефоннай сувязі, прадпрыемства "Белтэлекам", у ноч з 30 на 31 сакавіка тэлефонныя нумары служб хуткай медыцынскай дапамогі, пажарных, міліцыі, аварыйнай службы газу будуць зменены. Замест "03" трэба будзе набіраць "103", замест "02" — "102" і гэтак далей.

**Ул.інф.**

СУДЬБА

# Ушел в монастырь. И не вернулся

***"Несколько лет назад "Народная воля" много писала о бывшем директоре минского завода "Атлант" Леониде Калугине. О его аресте стало известно сразу после президентских выборов 2001 года. Ходили слухи, что бывший директор стал монахом. Расскажите, пожалуйста, какая судьба постигла Леонида Калугина на самом деле, где он сейчас, что с ним?"***

***Михаил Гречанников, Дубровно.***

До печально известного выдвижения кандидатом в президенты на выборах 2001 года имя директора ЗАО "Атлант" Леонида Калугина гремело не только в Беларуси, но и за пределами страны. Однако попытка конкурировать с действующим президентом обернулась для Л.Калугина личной трагедией: обвинениями в экономических преступлениях, судебным процессом, амнистией и принятием монашеского сана в подмосковном монастыре.

В 1993 году Леонид Калугин стал генеральным директором завода "Атлант". Работал в Совете Республики Национального собрания, где участвовал в деятельности Комиссии по международным делам и национальной безопасности. В этот период, в середине 1990-х, стал активно поддерживать православную церковь в Беларуси. В конце 1990-х Патриарх Московский и всея Руси Алексий II наградил Калугина орденом святого князя Владимира.

В 2001 году Л.Калугин попытался выдвинуться кандидатом в президенты. Но не набрал необходимых для регистрации ста тысяч подписей. 21 ноября 2001 года политика задержали по подозрению в совершении хозяйственных преступлений. 29 ноября 2001 года ему предъявлено официальное обвинение по трем статьям Уголовного кодекса: злоупотребление властью или служебными полномочиями, невозвращение из-за границы иностранной валюты и незаконная предпринимательская деятельность.

4 декабря 2001 года собрание акционеров ЗАО "Атлант" освободило от должности генерального директора Леонида Калугина и назначило на этот пост Виктора Шумило.

После проведенного расследования в 2004 году все обвинения с Леонида Калугина были сняты. Но это стало "моральным" поражением и послужило толчком к отречению от мирской жизни. В конце 2005 года Л.Калугин принял монашеский постриг в одном из монастырей Московской области и взял себе имя Никон. Потом, оказывается, вернулся в Беларусь.

Минское епархиальное управление Белорусского Экзархата Русской православной церкви сделало из местонахождения бывшего директора целую тайну. Пресс-секретарь Патриаршего Экзарха **Андрей Петрашкевич** сообщил, что Леонид Калугин, *"когда уехал в Москву, принял монашеский постриг в одном из подмосковных монастырей, вернулся в Беларусь; в нарушение церковной дисциплины, тем более дисциплины монашеской, не поставил в известность о своих шагах Минскую епархию, не вступает в отношения с Минской епархией. Епархия в свою очередь не считает нужным навязываться"*.

Секретарь Минского Епархиального управления отец **Николай Коржич,** к которому журналиста "Народной воли" отправил пресс-секретарь, также сослался на отсутствие информации об опальном директоре-монахе. *"Ничего нового нам не известно. Знаю, что он жив, здоров"*, — подчеркнул Н.Коржич.

Не желая бесцельно блуждать по всем ступеням церковной иерархии, мы нашли другой источник информации.

Оказывается, Леонид Калугин развелся с женой Людмилой сразу же после выхода на свободу. Уехал в Москву и в Подмосковье принял постриг в монахи. Примерно год назад — в январе 2006 года — вернулся в Беларусь. Под новым именем — Никон живет в мужском монастыре в деревне Вишневка — это в 20 километрах от Минска. На бывшего директора возложены обязанности по хозяйственной части.

*"Однако на контакт Калугин не идет,* — рассказал журналист Радио Свобода Игорь Карней, который ездил в Вишневку. — *Я попытался пообщаться с ним еще в январе прошлого года, но он заявил, что сейчас происходящее вокруг его не волнует. У него новое имя — Никон, но откликается и на свое мирское имя — Леонид Иванович"*.

**Георгий ГЛЕБУСЬ.**

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

# *«Новае жыццё» пераходзіць у наступ*

**У Вышэйшым Гаспадарчым судзе доўжыцца справа "Царква "Новае жыццё" супраць Мінгарвыканкама".**
**На апошнім судовым пасяджэнні юрысты "Новага жыцця" пераканаўча даводзілі хісткасць абвінавачванняў у адрас царквы, на падставе якіх гарадскія ўлады замахнуліся на царкоўную маёмасць — будынак і зямельны ўчастак. Прадстаўнікі Мінгарвыканкама так і не здолелі патлумачыць, якое "незаконнае будаўніцтва" і якія "незаконныя богаслужэнні" ладзілі вернікі "Новага жыцця".**

Царква ў сваю чаргу знаходзіць прыкметы складу злачынства ў дзеяннях аддзела па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Мінгарвыканкама (кіраўнік аддзела А.Рабіцава), а канкрэтна — злачыннае супрацьдзеянне законнай дзейнасці законным чынам зарэгістраванай рэлігійнай абшчыны. Юрысты царквы выказалі намер узбудзіць крымінальную справу супраць згаданай спадарыні. Даць паказанні супраць А.Рабіцавай гатовы былы дырэктар кінатэатра "Дружба" В.Кабалоеў. Быў час, калі, не маючы ўласнага памяшкання, царква арандавала ў гэтым кінатэатры залу для богаслужэнняў. Дык вось, паводле слоў В.Кабалоева, спадарыня Рабіцава тэлефанавала яму і ў катэгарычнай форме патрабавала парваць дамову з царквою "Новае жыццё". Пры гэтым прыгразіла, што калі загад не будзе выкананы, дырэктара кінатэатра звольняць з працы.

Суддзя спадарыня К.Каратке-віч не дала дазволу на выступленне ў судзе В.Кабалоева. Маўляў, да справы, якая разглядаецца, гэта непасрэднага дачынення не мае. Сваю гісторыю Кабалоеў распавядаў не ў зале суда, а ў фае — журналістам, што асвятляюць судовы працэс.

"Новае жыццё" вінаваціць аддзел па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Мінгарвыканкама ў тым, што, перашкаджаючы дзейнасці рэлігійнай абшчыны, гэтая ўладная структура фактычна пазбавіла горад рэабілітацыйнага цэнтра для сацыяльна не абароненых грамадзян. Такі цэнтр, дзе б ажыццяўляўся нагляд за адзінокімі старымі, праблемнымі падлеткамі, а яшчэ за хворымі на алкагольную і наркатычную залежнасць, плануе стварыць царква ў сваім будынку.

Прадстаўнікі гарвыканкама на гэта адказалі, што ў Мінску сёння існуе 9 сацыяльных цэнтраў — маўляў, хай царква не лезе не ў сваю справу. Адказаць на пытанне, ці дастаткова 9 гэткіх устаноў для нашага мегаполіса, прадстаўнікі ўлады не здолелі.

**Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.**

ЧУЛІ?

## *Аляксандр Вайтовіч атрымаў «партфель»*

**Аляксандр Вайтовіч абраны старшынёй Міжнароднага грамадскага руху "Супрацоўніцтва і прагрэс". Устаноўчая канферэнцыя руху прайшла ў Маскве.**

Прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў 1997—2000 гадах, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у 2001—2003 гадах атрымаў пры галасаванні падтрымку ўсіх удзельнікаў канферэнцыі, паведамляе прэс-служба А.Вайтовіча.

Заснавальнікамі руху выступілі *"грамадзяне Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь"*. Рух плануе ажыццяўляць сваю дзейнасць *"на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Беларусь і іншых краін, дзейнічаць у адпаведнасці з Канстытуцыяй Расійскай Федэрацыі, яе міжнароднымі дагаворамі, Федэральным законам "Аб грамадскіх аб'яднаннях", іншымі законамі і нарматыўна-прававымі актамі Расійскай Федэрацыі і іншых краін"*.

Сярод аб'яўленых мэт руху садзеянне пашырэнню палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва Беларусі, Расіі і іншых краін; садзеянне станаўленню дэмакратычнай дзяржавы ў Беларусі, падтрымцы незалежнай беларускай дзяржавы з боку Расійскай Федэрацыі і ўсёй сусветнай супольнасці; садзеянне дыялогу і ўзаемаразуменню ў беларускім грамадстве, пераадоленню ў ім палітычных, сацыяльных і іншых канфліктаў.

Рух плануе стварыць міжнародную структуру сваіх арганізацый, філіялаў і прадстаўніцтваў; выступаць супраць парушэнняў правоў грамадзян, незалежна ад іх палітычных перакананняў, мовы, нацыянальнасці, веравызнання і г.д.; збіраць і распаўсюджваць інфармацыю аб парушэннях правоў чалавека ў Беларусі, рыхтаваць звароты і прапановы па гэтых пытаннях у дзяржаўныя органы Беларусі і міжнародныя арганізацыі.

**Дзмітрый УЛАСАЎ.**

ТЕНДЕНЦИИ

# Управление делами президента добралось до цемента

*Незаметно для широкой общественности в течение прошлого года выстроилась новая структура, которая уже получила и продолжает получать под свой полный или частичный контроль наиболее доходные сегменты белорусского рынка. Это — РПТУП "Беларусьторг", находящееся в введении Управления делами президента (УДП). Вслед за углем, лесом, табаком, с которыми уже работает "Беларусьторг", эта фирма сделала серьезную заявку на то, чтобы монополизировать экспорт белорусского цемента.*

На белорусских цементных заводах считают это уже решенным делом и практически безропотно собираются отдать свой экспорт УДП.

"Беларусьторг", похоже, претендует на лавры некогда прославившейся пропрезидентской структуры "Белая Русь". Собственно, по сути "Беларусьторг" является правопреемником скандально известной и обанкротившейся после ареста бывшего президентского управделами Галины Журавковой "Белой Руси". И монополия на поставки каменного угля (в 2007 году — 220 тысяч тонн), и участие в поставках импортных табачных изделий перешли к "Беларусьторгу" "по наследству". Но горизонты деятельности этой фирмы за последний год были несколько расширены. Так, "Беларусьторг" в консорциуме еще с тремя госструктурами сейчас поставляет в статусе спецэкспортера белорусскую древесину за рубеж. Это право досталось предприятию в рамках реструктуризации УДП в середине 2006 года от еще одного коммерческого образования этого ведомства — предприятия "Белвнешторгинвест".

Выход УДП и "Беларусьторга" на цеметный рынок состоялся прошлым летом, когда на белорусском рынке неожиданно возник дефицит "серого вещества". Власти обвинили в этом самих производителей, которые вместо поставок на внутренний рынок в массовом порядке вывозили цемент за рубеж. С благородной целью пресечения "бесконтрольного" экспорта и "обеспечения потребностей страны" в дефицитном товаре вывоз цемента за рубеж был временно поручен УДП. Но так уж повелось в Беларуси, что все переданное УДП временно остается там постоянно.

Теперь "Беларусьторг" хочет юридически оформить свое доминирование в экспорте цемента. Наши собеседники считают, что это желание появилось отнюдь не случайно и обосновано соответствующими экономическими расчетами. Последние заключаются в том, что продавать цемент в России или в ЕС выгоднее, чем поставлять его на внутренний рынок (хотя везде спрос на цемент растет). Так, внутри Беларуси для производителей цемента установлен предельно допустимый уровень рентабельности реализации. Все три производителя — "Красносельскстройматериалы", "Кричевцементношифер" и Белорусский цементный завод — по белорусскому законодательству отнесены к монополистам, для которых уровень рентабельности продаж не должен превышать 25%. На рынках России и ЕС таких ограничений для них нет. Чем, собственно говоря, до недавних пор пользовались белорусские заводы. Даже реализуя цемент на российском рынке дешевле продукции местных производителей, рентабельность у них достигала там 40% и больше.

Последнее обстоятельство обусловлено ситуацией на цементном рынке нашей восточной соседки: цемента там в связи с ростом строительства катастрофически не хватает. Поэтому только в первом полугодии 2006 года цены на цемент в России выросли на 65% по сравнению с аналогичным периодом прошлого года и составляют сейчас в среднем 75 долларов за тонну. Для сравнения: средняя цена тонны цемента на белорусском рынке — 40 долларов. Причем эксперты прогнозируют, что рост цен в России будет продолжаться. Местные производители уже не в состоянии покрывать спрос на эту продукцию, а строительство новых мощностей является весьма затратным по вложениям и окупается очень медленно.

Неслучайно, считают наши эксперты, на эту ситуацию обратили внимание в УДП. Тем более что нынешний год, по оценкам российских аналитиков, станет первым годом на российском рынке, с которого производство цемента на местным мощностях не будет успевать за объемами его потребления. А это значит, что цена цемента, российского или белорусского, резко пойдет вверх.

Можно посчитать, на какой куш могут рассчитывать в УДП. В текущем году ожидается, что на всех трех белорусских цементных заводах Беларуси будет произведено 3,36 млн тонн "серого вещества". Из этого объема 295 тысяч тонн предполагается экспортировать в страны СНГ (в первую очередь в Россию), 75 тысяч тонн — в страны дальнего зарубежья (в основном традиционным покупателям белорусского цемента в Польше, Литве, Латвии). Даже при сохранении нынешнего среднего уровня цен на цемент в России (75 долларов за тонну) УДП подминает под себя экспорт стоимостью более чем 22 млн долларов. Еще около 8 млн долларов (также исходя из нынешнего среднего уровня цен на цемент в Европе 100—110 долларов за тонну) — это стоимость возможного объема поставок цемента в страны ЕС.

Без преувеличения, это весьма лакомый кусок, тем более что производители скорее всего примут все условия посреднических договоров, навязанные со столь уважаемой структуры. Даже увеличение стоимости газа, как обещано в правительстве, не должно отразиться на конкурентоспособности белорусского цемента: оно будет компенсировано за счет бюджета, через предоставление льготных цен на газ. Компенсировано, как оказывается теперь, чтобы позволить заработать на цементе в том числе и УДП.

**Вадим СЕХОВИЧ.**
*ej,by*

## *За месяц кошт кватэр у Мінску павысіўся на 5—7 тысяч долараў*

**Сярэдні кошт квадратнага метра ў сталіцы дасягнуў 1225 долараў.**

На пачатку года абрынуліся надзеі соцень тысяч беларусаў на тое, што нарэшце ўдасца набыць свае асабістыя квадратныя метры. І, на думку рыэлтэраў, рост кошту "квадрата", які мы назіраем зараз, гэта толькі пачатак.

Па інфармацыі агенцтва нерухомасці "Загородный дом", значна даражэйшымі сталі перш за ўсё аднапакаёвыя кватэры, хаця цэны растуць і на двух- і трохпакаёўкі. Калі ў снежні "адзіначка" каштавала ў сярэднім 42—45 тысяч долараў, то зараз — 50 тысяч. Нават "хрушчоўкі" хуценька прадаюцца за 45—48 тысяч долараў.

Двухпакаёвая кватэра ў не самым блізкім да цэнтра раёне Паўднёвы Захад, у панельным доме, агульнай плошчай 50 квадратных метраў (з чэшскай планіроўкай, дзе значную плошчу "з'ядае" калідор), ужо лёгка прадаецца за 70 тысяч долараў! Рыэлтэры кажуць: "Купіць кватэру зараз — значыць выйграць, прадаць — адпаведна прайграць". Пад дыктафон прагнозаў яны, праўда, не робяць, але па сакрэце расказваюць, што, не выключана, на пачатак 2008 года цэннік у сталіцы наблізіцца да 2 тысяч долараў за квадратны метр.

Па інфармацыі беларускага штотыднёвіка "Нерухомасць для ўсіх", сярэдняя цана квадратнага метра ў сталіцы на 9 студзеня 2007 года складала 1225 долараў.

Для параўнання:
— студзень 2002 года — 325 долараў;
— студзень 2003 года — 378 долараў;
— студзень 2004 года — 520 долараў;
— студзень 2005 года — 680 долараў;
— студзень 2006 года — 1034 долары.

Гэта і ёсць жывая дэманстрацыя таго, як паспяхова дзяржава вырашае кватэрнае пытанне.

**Ірына ОСІПАВА.**
*www.bulletinonline.org*

Народная Воля http://www.nv-online.info
26 СТУДЗЕНЯ 2007 г.

ТЭМА ДНЯ

# Трывожныя сімптомы,

## *або Як паўплываюць на наша жыццё новыя кошты на расійскія энерганосьбіты?*

Як вядома, з сёлетняга года цана за расійскі газ больш чым падвоілася. Яна вырасла з 46 "з хвосцікам" долараў за тысячу кубічных метраў да 100 долараў. Уведзена пошліна на куплю нафты ў суме 53 долары за тону. Акрамя таго, прыйдзецца дзяліцца з Расіяй прыбыткам ад продажу нафтапрадуктаў у трэція краіны. У выніку краіне трэба шукаць дадатковыя велізарныя сродкі на куплю энерганосьбітаў. Яны складаюць мільярды долараў. Як жа гэта адаб'ецца на нашым жыцці?

Улады пераконваюць, што рэзкае павышэнне коштаў за нафту і газ не пагоршыць жыццё нашага грамадства. Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Андрэй Кабякоў заявіў, што бюджэт краіны не панясе страт ад пераходу на новыя ўмовы куплі расійскай нафты і што ніякага незапланаванага росту цэн не будзе.

Гэтымі днямі, наведваючы завод бытавой тэхнікі ЗАТ "Атлант", Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што кіраўніцтва краіны "народ у бядзе не пакіне". *"Мы будзем рабіць усё, каб ствараць аптымальныя ўмовы для народа"*, — сказаў ён.

Менавіта ў гэты самы час прыйшло паведамленне аб павышэнні коштаў за жыллёва-камунальныя паслугі. Словам, кажуць адно, робяць другое.

### Павялічаны тарыфы на газ, электрычнасць і ацяпленне

Павялічаны заднім чыслом, з 1 студзеня. Па інфармацыі міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Уладзіміра Белахвостава, у адпаведнасці з рашэннем урада, тарыфы на газ і электрычнасць узраслі на 20 працэнтаў, цеплавую энергію — на 12 працэнтаў. У выніку, як сцвярджаюць чыноўнікі, на двухпакаёвую кватэру плацяжы павялічваюцца на 5 долараў.

Намеснік прэм'ер-міністра Віктар Бура запэўнівае, што сёлета павышэння тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі для насельніцтва больш не павінна быць, калі не ўзнікнуць якія-небудзь "форс-мажорныя абставіны". А работнікі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі гавораць, што будуць шукаць іншыя крыніцы для мінімізацыі наступстваў ад павышэння цэн на энергарэсурсы.

Шчыра кажучы, мала верыцца ў гэта. А калі дакладней, то зусім не верыцца, бо добра вядома цана слова чыноўнікаў і самых высокіх асоб. Колькі разоў сам Аляксандр Лукашэнка гаварыў, што тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі павялічацца за год толькі на пяць долараў. А ў мяне толькі за адзін месяц летась, за снежань, плата за кватэру вырасла на 34 тысячы рублёў, больш як на 15 долараў. А за паўгода — амаль падвоілася. Чамусьці раптоўна жыхары нібыта сталі ў два разы болей спажываць вады, як халоднай, так і цёплай. Вось такія яны "форс-мажорныя абставіны". Так што вядома, што гэта за "іншыя крыніцы для мінімізацыі наступстваў". Складваецца ўражанне, што іншых крыніц, акрамя як "залезці ў кішэні грамадзян", камунальнікі не ведаюць.

Следам за гэтым, літаральна праз дзень, стаў даражэйшым бензін.

### Зноў павялічаны цэны на бензін

Аб гэтым аб'явіў канцэрн "Белнафтахім". З 20 студзеня новыя рознічныя цэны на бензін, рэалізуемы праз АЗС, складаюць: бензін А-76 (Н-80) — 1470 рублёў за літр (рост на 5%), бензін А-92 — 1840 рублёў (на 4,5%), бензін А-95 — 2100 рублёў (на 5%), дызельнае паліва — 1470 рублёў (рост на 5%).

З 27 лістапада 2006 года гэта ўжо трэцяе павышэнне цэн на нафтапрадукты. Тады цэны выраслі на 4,5—4,8 працэнта.

# А вы ўнеслі ўзнос у «заначку»?

## *Што чакае вытворчыя калектывы? Як адаб'ецца павышэнне цэн на энерганосьбіты на рабоце прадпрыемстваў?*

Дакладнай яснасці тут пакуль няма. Было заяўлена, што павышэнне цаны на расійскі газ абыдзецца нашаму прамысловаму комплексу ў адзін трыльён рублёў, ці каля 470 мільёнаў долараў дадатковых затрат. Аб гэтым паведаміла на прэс-канферэнцыі ў Мінску намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення эканомікі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання **Ала ЛАМАГІНА.**

Вядома таксама, што прадпрыемствы прамысловасці распрацавалі і накіравалі ў Міністэрства свае планы па зніжэнні затрат. А ва ўрадзе рыхтуецца спіс найбольш энергазатратных вытворчасцяў, якім плануецца прадаваць газ па льготных цэнах.

Намеснік генеральнага дырэктара вытворчага аб'яднання "Гомсельмаш" **Дзмітрый ЛІС** паведаміў, што праведзены папярэднія эканамічныя разлікі работы прадпрыемства ў новых умовах. *"Па самых грубых разліках мы чакаем зніжэння рэнтабельнасці на 10 працэнтаў"*, — сказаў ён. А падаражэнне прадукцыі чакаецца не менш як на 30 працэнтаў. Ці будзе яна пры гэтым канкурэнтаздольнай?

Разам з тым, па словах начальніка ўпраўлення аналізу і прагнозу Міністэрства прамысловасці **Алы ЮРКЕВІЧ,** вывучэнне разлікаў з прадпрыемстваў паказвае, што ў іх ёсць рэзервы і рэсурсы для паспяховай работы ў крайнім выпадку ў першым квартале. Па выніках працы за першыя тры месяцы міністэрства зробіць аналіз фінансавага стану прадпрыемстваў і будзе прымаць рашэнне аб неабходнасці карэкціроўкі прагнозных паказчыкаў развіцця прамысловых прадпрыемстваў. Магчыма, карэкціроўка і не спатрэбіцца. *"Яшчэ рана аб гэтым гаварыць, паколькі ні міністэрству, ні прадпрыемствам не даведзены канкрэтныя даныя аб цэнах на энерганосьбіты"*, — тлумачыць спецыяліст.

Як вядома, расійскі газ стаў даражэйшым у два разы, пошліна на нафту складае 53 долары за тону. Так што нашым прадпрыемствам прыходзіцца сур'ёзна раскашэльвацца. А тут яшчэ ўзносы на "заначку". У краіне створаны фонд нацыянальнага развіцця. Канешне, такая "заначка" патрэбна. Але як яе ствараць? Беларускіх экспарцёраў абавязалі пералічваць у яго частку прыбытку. З-за чаго ўзніклі новыя праблемы. Аб іх расказалі "Беларускія навіны" і Прайм-ТАСС. Размова ідзе пра Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод, які абавязалі пералічыць у згаданы фонд 229 млрд рублёў. З такім рашэннем не пагадзілася расійская кампанія "Славнефть". Як акцыянер названага завода яна напамінае аб недапушчальнасці такога размеркавання прыбытку, паколькі гэта моцна ўскладніць фінансавае становішча прадпрыемства, якое цяпер па новых цэнах купляе нафту. У яго хутка не стане грошай, яно вымушана будзе браць крэдыты, што прыкладна на 10 працэнтаў зменшыць рэнтабельнасць яго працы. Па інфармацыі згаданых крыніц, Мазырскі НПЗ у канцы мінулага года накіраваў ва ўрад разлікі, якімі аргументуе неабходнасць адмены выплаты ў фонд развіцця.

# Будзе складаней і складаней

## *Што думаюць наконт гэтага эксперты і спецыялісты? Якая ж перспектыва нашых прадпрыемстваў і эканомікі?*

Намеснік прэм'ер-міністра Андрэй Кабякоў лічыць, што новае пагадненне на нафту не нанясе ўрону для нашых нафтаперапрацоўчых заводаў. Ім будзе выгадна купляць расійскую нафту на новых умовах, а ў бюджэце не будзе страт.

Па ацэнцы эканаміста Яраслава Раманчука, страты ад павышэння цаны на газ, увядзення пошліны на нафту і падзел даходаў ад экспарту з Беларусі нафтапрадуктаў складуць каля 6 працэнтаў ВУП. Таму зацверджаныя паказчыкі развіцця на 2007 год не будуць рэалізаваны.

Хто ж з іх мае рацыю? Думаецца, адказ у тлумачэннях эксперта даследчага цэнтра "Інстытут прыватызацыі і менеджмента" **Алены РАКАВАЙ.** На яе думку, раней ад нафты мелі добрыя даходы беларускі бюджэт, расійскія "давальцы". А вось расійскі бюджэт нёс страты. Цяпер, па новай схеме, даходы ідуць у бюджэты Расіі і Беларусі, затое ў пройгрышы аказаліся расійскія "давальцы" і беларуская нафтаперапрацоўка. Расіянам стала нявыгадна пастаўляць нафту на беларускія заводы. У выніку прыбытак нашых нафтаперапрацоўчых заводаў зменшыцца, і працаваць ім будзе ўсё складаней і складаней.

І як пацвярджэнне гэтага, звальненне з пасады намесніка старшыні канцэрна "Белнафтахім" Анатоля Дзядкова. Як сказана ў пастанове Савета міністраў, "за невыкананне даручэнняў у складанай крытычнай сітуацыі, а таксама за незабеспячэнне вытворчай загрузкі нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў канцэрна".

* * *

Як бачым, дакладных разлікаў на тэму, што знайшлі, што згубілі, як рухацца наперад у новых умовах, пакуль няма. Але ёсць трывожныя сімптомы бяды, што набліжаецца. Яны не толькі ў павышэнні коштаў за камунальныя паслугі, росце цаны на бензін... Яны, трывожныя ноткі, гучаць у прамовах самога Аляксандра Лукашэнкі. Наведваючы завод бытавой тэхнікі ЗАТ "Атлант", ён гаварыў, што новыя ўмовы гаспадарання, у якіх апынулася краіна, прад'яўляюць высокія патрабаванні. На першы план выходзяць беражлівасць, уменне эканоміць, атрымліваць як мага большы вынік пры меншым спажыванні рэсурсаў. Нам трэба перастаць нык аць, разумеючы, што таннага газу і нафты нам ніхто не дасць. Беларусы павінны разумець, што разлічваць яны могуць толькі на сябе...

Пры добрай перспектыве так не гавораць. Так гавораць напярэдадні цяжкіх выпрабаванняў.

**Алесь ДРАБЧУК.**

# *Сколько построят жилья и за чей счет?*

Утвержден план проектирования, строительства и финансирования жилья для граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий, на 2006—2010 годы. В соответствии с постановлением правительства №1808 всего за пятилетку для данной категории граждан предполагается ввести в эксплуатацию 19,232 млн кв.м жилья, или 74% от общего ввода. В том числе в 2007 году доля жилья, построенного для граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий, должна составить 71%, в 2008 году — 76%, в 2009 году — 78%, в 2010 году — 80%. Об этом сообщается на сайте Совета министров.

*"За последние 15 лет это первая пятилетка, которая предусматривает такие большие задачи в области строительства жилья для граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий"*, — прокомментировали в Минстройархитектуры.

Всего за 2006—2010 годы в Брестской области такого жилья планируется ввести 2,938 млн кв.м, в Витебской — 1,955 млн, Гомельской — 2,566 млн, Гродненской — 2,348 млн, Минской — 3,305 млн, Могилевской области — 1,74 млн, в Минске — 4,38 млн кв.метров.

В сельских населенных пунктах и малых городских поселениях за пять лет для нуждающихся намечено ввести в эксплуатацию 6,778 млн кв.м жилья, в том числе в 2007 году — 1,222 млн кв.метров.

За чей же счет будет строиться жилье?

Объем финансирования жилищного строительства в Беларуси в 2007 году за счет всех источников должен составить 4,192 трлн рублей. Такой показатель утвержден совместным постановлением Совета министров и Национального банка Беларуси №1807/23 от 31 декабря 2006 года. Финансирование строительства жилья за счет кредитов банков составит 2,194 трлн руб., в том числе льготных кредитных ресурсов — 2,035 трлн рублей. Средства населения в финансировании жилищного строительства предполагаются в размере 1,641 трлн руб., консолидированного бюджета — 254 млрд руб., организаций — 103,5 млрд рублей.

Так что почти все оплатят граждане. Из бюджета и организаций будет выделено лишь 357,5 млрд руб., а граждане внесут 2,194 трлн рублей. Кредиты составят 2,194 трлн рублей.

Но ведь их надо отдавать, к тому же с процентами.

**Подготовил Сергей ИВАНОВ.**

# *У тройцы сусветных лідэраў*

Як паведамілі ў маркетынг-цэнтры Мінскага трактарнага завода, летась на экспарт пастаўлены 41.744 трактары і машыны, што на 18,6% больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года.

У 2006 годзе МТЗ аднавіў пасля доўгага перапынку пастаўкі трактароў у Гвінею, Зімбабве, Ліберыю, Ліван, Нігерыю, Манголію, Марока, Іран, Перу, Францыю. У 2007 годзе плануецца арганізацыя зборачнай вытворчасці мінскіх трактароў у Венесуэле і Бразіліі. Прадпрыемства сёлета плануе павялічыць аб'ём экспарту не менш як на 15% у параўнанні з 2006 годам.

Паводле звестак МТЗ, за ўсю гісторыю прадпрыемства трактары пастаўляліся ў 126 краін. Зараз завод працягвае асвойваць рынкі Лацінскай Амерыкі, Азіяцкага рэгіёну, Афрыкі і Усходняй Еўропы. Сярод прыярытэтаў — пашырэнне рынку збыту ў Расіі і краінах СНД.

Трэба адзначыць, што ў 2006 годзе МТЗ увайшоў у тройку сусветных лідэраў па вытворчасці колавых трактароў.

**Марына НОСАВА.**

ЧТО НА ПРЕДПРИЯТИЯХ?

# *Меньше, чем год назад*

**Объем производства калийных удобрений в Беларуси в 2006 году снизился на 4,9 процента по сравнению с 2005 годом.**

По данным Министерства статистики и анализа, в 2006 году было добыто 4 млн 605,3 тыс тонн калийных удобрений. В целом промышленный объем производства минеральных удобрений снизился на 3,5% и составил 5 млн 468,8 тыс тонн.

# *На работу «под мухой»*

**В Беларуси в прошлом году за распитие спиртных напитков, употребление наркотических, токсических средств в рабочее время или по месту работы контракты расторгнуты с 10 тыс. 389 работниками.**

Об этом на итоговой коллегии департамента государственной инспекции труда Минтруда и соцзащиты сообщил директор департамента Анатолий Садовничий.

Вместе с тем, подчеркнул он, в 2006 году сотрудниками правоохранительных органов выявлено 28 тыс. 117 человек, находившихся на рабочем месте в нетрезвом состоянии.

# *В результате несчастных случаев*

**В прошлом году в результате несчастных случаев на производстве погиб 241 и тяжело травмированы 780 работников.**

Допущен рост количества погибших работников в организациях Министерства транспорта и коммуникаций 25(12), Министерства энергетики 6(4), концернов "Беллесбумпром" 5(2) и "Белнефтехим" 4(2), коммунальной и частной (малое предпринимательство, индивидуальные предприниматели) форм собственности Гомельской 13(12), Гродненской 19(13) и Минской областей 21(20).

Основными причинами производственного травматизма с тяжелыми последствиями явились: нарушение потерпевшими трудовой и производственной дисциплины, инструкций по охране труда (19,0 процентов); личная неосторожность потерпевших при отсутствии опасных производственных факторов (11,5 процента); эксплуатация неисправных, не соответствующих требованиям безопасности машин, механизмов, оборудования, оснастки, инструмента (9,8 процента); невыполнение руководителями и специалистами обязанностей по охране труда (8,5 процента); недостатки в обучении и инструктировании потерпевших по охране труда (7,5 процента); нарушение требований безопасности труда другими работниками (6,2 процента); неудовлетворительное содержание и недостатки в организации рабочих мест (5,9 процента); нарушение требований безопасности при эксплуатации транспортных средств, машин, механизмов, оборудования (5,2 процента).

**Евгений ТАВГЕНЬ.**

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА

# Подозревая худшее...

Худшие сценарии развития событий в белорусской экономике начинают, к сожалению, сбываться. Еще в конце уходящего 2006 года, когда стало очевидно значительное повышение цен на российские газ и нефть, население Беларуси смекнуло, что это может вызвать инфляционный всплеск и девальвацию белорусского рубля. В банковской системе наблюдался определенный ажиотаж: все большее число вкладчиков досрочно снимало свои рублевые сбережения, угрожая тем самым подорвать рублевую ликвидность банков.

Скорее всего, одни граждане стремились за эти рубли отовариться по ценам 2006 года, пока они еще оставались, другие — конвертировать рубли в твердую валюту. Однако соответствующего притока денег в валютные вклады не наблюдалось. Не наблюдается и сегодня. Скорее всего народ, подозревая худшее в стабильности банковской системы Беларуси, определяет валюту в "банки стеклянные", или, как говорят, складывает ее в чулок.

Спрос физических лиц на валюту уже который месяц превышает ее продажу банкам населением. За 11 месяцев 2006 года населением продано банкам 3156,9 млн долларов наличной иностранной валюты, а приобретено на сумму 3759 млн долларов. На Белорусской валютно-фондовой бирже спрос на доллары постоянно превышает их предложение. К середине декабря 2006 года международные резервные активы Национального банка составили величину уровня начала года — порядка 1600 млн долларов США. На начало 2007 года они превысили 1700 млн, увеличившись за истекший год на 7—8%. Однако это говорит о том, что предусмотренное в Основных направлениях денежно-кредитной политики Республики Беларусь на 2006 год задание по увеличению золотовалютных резервов страны на 475—525 млн долларов не выполнено.

Дефицит валюты, отсутствие достаточных ее государственных резервов — прямая предпосылка к снижению обменного курса белорусского рубля по отношению к твердым валютам. Между тем глава Нацбанка П.Прокопович не уставал заявлять, что белорусский рубль — устойчивая национальная валюта и такой будет, несмотря на какие-то внешние факторы. Но изменится ли от ободряющих высказываний поведение вкладчиков? Ведь сегодня население является основным донором банковской системы страны, до сих пор исправно пополнявшим ее ресурсы своими депозитами.

Еще в начале декабря прошлого года российское правительство объявило о введении с 2007 года экспортной пошлины на поставляемую в страну для переработки сырую нефть в размере 180 долларов за тонну, делая тем самым работу наших нефтеперерабатывающих комплексов убыточной. Это результат того, что белорусы никак не соглашались каким-то образом поделиться с российским бюджетом доходами в виде взимаемых экспортных пошлин от нефтепродуктов. Ответ белорусского руководства не заставил долго себя ждать. С 1 января оно ввело беспрецедентную, не известную мировой экономической практике пошлину на перемещение российской нефти по своей территории в 45 долларов и начало отбор в свои резервы транзитной нефти. Россияне вынуждены были перекрыть нефтяные краны. Все это до крайности усугубило ситуацию.

Почти двухсуточные переговоры в Москве привели к тому, что россияне не отказались от введения таможенной пошлины на свою нефть, поставляемую на наши нефтеперерабатывающие комплексы, а только снизили ее до 53 долларов на 1 тонну. Это составляет 29,3% от пошлины на нефть, поставляемую в другие страны (в 2008 году эта доля возрастет до 33,5%, а в 2009-м — до 35,6%). Будут поделены в невыгодных для нас пропорциях между белорусским и российским бюджетами и доходы от экспортных пошлин, взимаемых за белорусские нефтепродукты. Таким образом, спор субъектов хозяйствования в очередной раз был разрешен на президентско-премьерском уровне. Но, что еще хуже, поведение белорусской стороны в нефтегазовых переговорах еще раз показало России и международному сообществу непредсказуемость белорусского руководства. В итоге, повышение цен за счет введения пошлины на российскую нефть и сокращение доходов от экспорта нефтепродуктов потребуют от белорусской экономики дополнительно изыскать порядка 2,2 млрд долларов для расчетов за российские энергоносители и других нужд, а повышение цен на российский природный газ в 2,14 раза — еще не менее 1 млрд долларов.

Где их взять?! Осмелюсь утверждать: этого на сегодня никто толком не знает. Российский же бюджет благодаря этим соглашениям получит 1,58 млрд долларов, которые он ранее терял в обмен на поддержку братского Союзного государства.

Общие потери от перехода расчетов за российские энергоносители на рыночные принципы (как того и добивалась российская сторона) по некоторым оценкам могут составить примерно 10% производимого в стране ВВП. Полученные за продажу половины активов "Белтрансгаза" российскому "Газпрому" миллиарды долларов могут лишь частично и временно смягчить ожидаемые негативные последствия. К тому же в декабре 2006 года стало известно о решении Евросоюза исключить Беларусь из Генеральной системы преференций, которая давала возможности пониженного обложения таможенными пошлинами белорусского экспорта в страны Западной Европы. Это грозит потерей еще 300—400 млн долларов.

Правительство Беларуси начало предпринимать определенные меры по изысканию компенсаторов грядущих финансовых потерь. Ведь предстоит доказать, что белорусская экономическая модель с определяющей ролью государственной собственности и сильным централизованным управлением опирается не на благоприятную внешнеэкономическую рыночную конъюнктуру в виде дешевых российских энергоносителей и не на невзыскательных российских потребителей белорусских товаров, а на иные факторы, которые называют белорусской спецификой. В стране создан государственный целевой бюджетный фонд национального развития. К концу 2006 года в нем правительство намеревалось аккумулировать средств до 600 млн долларов в эквиваленте. За счет отчислений от прибыли относительно высокорентабельных предприятий того же нефтехимического комплекса, поломав тем самым все их инвестиционные программы.

Конечно, "заначку" надо было делать гораздо раньше. Вероятно, придется вновь возвращаться к вопросам изыскания дополнительных доходов от приватизации госимущества, к проблемам изменения порядка финансирования нашего сельского хозяйства и ко многому другому, что называют недореформированной белорусской экономикой.

Пока суть да дело, январские дни показывают, что мрачные прогнозы сбываются: банковская система, мягко говоря, испытывает затруднения в удовлетворении кредитных потребностей предприятий в валюте. Особенно крупных субъектов хозяйствования, в том числе тех, которые осуществляют текущие валютные платежи. Коммерческие банки не успевают подкреплять наличной валютой свои валютные кассы и пункты обмена валюты — население продолжает лихорадочно скупать доллары и евро. Просачивается информация, что, мол, американский президент Буш в рамках Акта о демократии в Беларуси грозится арестовать корсчета белорусских банков в США.

По мнению некоторых экспертов, Нацбанк сумеет более или менее удерживать обменный курс белорусского рубля в течение одного, максимум двух кварталов. Вот тут действительно председателю Нацбанка П.Прокоповичу придется приложить героические усилия для удержания ситуации под контролем.

Не хотелось бы сгущать краски, но события таковы, что приходится всем нам думать о том, как сохранить в наступившем году свой жизненный уровень, не откупоривая в год свиньи свои кубышки-копилки.

**Сергей КРАВЦОВ, экономист.**

Народная Воля http://www.nv-online.info
26 СТУДЗЕНЯ 2007 г.

ПРОГНОЗ

## Каким будет мир через 15 лет?

**Центр европейских реформ публикует перспективный прогноз**

Марк Леонард, долгое время отвечавший за внешнюю политику в Центре европейских реформ расположенной в Лондоне лаборатории идей, опубликовал работу "Разделенный мир: борьба за первенство в 2020 году".

Исследователь считает, что мир станет четырехполюсным, а не сконцентрированным вокруг единственной супердержавы — Соединенных Штатов. США столкнутся с полюсом, сформированным Китаем и Россией, которые *"прибегнут к международному праву для защиты своей автократии от любого внешнего вмешательства"*. Европейский Союз и дальше будет делать ставку на многополярный мир и сотрудничать с демократическими странами. Что касается Среднего Востока, он станет зоной "веры", где не будет места ни демократии, ни правовому государству.

В исследовании Марка Леонарда экономика является главным фактором, объясняющим новую геополитическую расстановку сил. В 2020 Китай обгонит США и выйдет на первое место в мире по уровню развития экономики. Индия займет третье место, сильно обогнав Японию и ЕС. Что касается России, она все так же будет получать прибыль от высокой цены на нефть, но ее экономика останется на уровне экономики Франции.

Соединенные Штаты сохранят свой статус ведущей экономической, военной и культурной державы, но будут вынуждены все чаще согласовывать свои действия с Китаем, Европейским Союзом, Индией и Японией.

Средний Восток снова станет ареной идеологической борьбы, главным образом между умеренным и радикальным исламом. Некоторые страны вернут или приобретут влияние на Среднем Востоке: Россия, Индия и Китай, причем Китай может стать главной внешней силой в регионе. Некоторые мусульманские страны сохранят верность США, другие повернутся к Китаю.

Саудовская Аравия, по предположению Марка Леонарда, изменит свою позицию наиболее радикальным образом: она будет искать защиты у Китая, своего главного клиента, отказавшись от помощи Соединенных Штатов. Индия наконец усилит свое влияние, но не настолько, чтобы единолично стать одним из полюсов. Она будет отстаивать в первую очередь свои собственные интересы. На смену "моральной" внешней политике Неру придет всесторонняя "реал-политик".

**Стефан БЮССАР.**

ФОТООКНО

## Меркель—Путин

**Президент Путин сказал, что у России проблем с Германией нет. О чем же он тогда спорил с канцлером ФРГ Ангелой Меркель в Сочи? Таким вопросом задается Би-Би-Си.**

Со своей стороны Ангела Меркель заявила, что ЕС необходимо и далее развивать диалог с Россией, чтобы избежать дальнейших, как она выразилась, "раздражителей".

Успехом встречи, считают аналитики, является то, что стороны сумели, в общем и целом, разрешить конфликт, вызванный прекращением импорта российской нефти в Европу, вследствие остановки нефтепровода "Дружба". Ангела Меркель в интервью Первому телеканалу немецкого телевидения ARD указала, что Россия в будущем намерена заблаговременно информировать европейских партнеров о возможных перебоях в энергоснабжении.

ЕВРОПЕЙСКАЯ ИДЕОЛОГИЯ

# Подними голову и посмотри в небо

— Мне кажется, многое объясняется тем, что меня и мое творчество упорно не ассоциируют с белорусской эстрадой... Недавно на одном из концертов за кулисами ко мне подошла женщина из Гродно. Она с таким изумлением говорила: "Неужели вы — Николь? У нас по радио ваши песни постоянно звучат, но никто не думает что вы — наша".

И все-таки мы потихонечку движемся в направлении публичности. На днях готовлюсь принять съемочную бригаду белорусского телевидения во главе с Томой Лисицкой. Программа "Вот такие пироги" семейная, так что сниматься буду с родителями. Кстати, сказали, что мне печь пироги вовсе не обязательно — они со своими приходят.

**Татьяна ПАВЛИКОВА.**

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

## *«Хадановіч — паўсюль!»*

**Ён здольны быць усім, і ўсё можа быць Хадановічам**

Такую выснову ў выніку сваіх даследаванняў творчасці паэта **Андрэя Хадановіча** агучыў філосаф і журналіст **Максім Жбанкоў** на паэтычна-музычнай вечарыне "Размова з рэхам", што днямі адбылася ў Палацы моладзі.

Па меркаванні Максіма Жбанкова, у адрозненне ад знакамітага філосафа **Валянціна Акудовіча**, якога, па ўласным прызнанні, няма, *"з Андрэем праблема: ён ёсць і нават занадта"*. Падобнае ўражанне, відавочна, склалася і ў **Уладзіміра Арлова**: *"Цыбатая постаць Андрэя Хадановіча вылезла з-пад коўдры на даляглядзе айчыннага прыгожага пісьменства яшчэ зусім нядаўна. Але мінула некалькі гадоў, і цяпер без Андрэя проста немагчыма ўявіць наш літаратурны краявід, і сёння ад Хадановіча хіба што можна яшчэ схавацца ў нетрах прозы, але ягонае эсэ ў апошнім нумары "Нашай Нівы" сведчыць, што і гэты прытулак робіцца ненадзейным"*.

Хадановіч паўсюль. Хадановіч непазбежны. І яшчэ адным пацвярджэннем гэтага стаў выхад у друк ягонай кнігі "Сто лі100ў на tut.by", прэзентацыя якой і адбылася на вечарыне. Гэта першае выданне з новай серыі "Кнігарня "Нашай Нівы". Але далёка не апошняе. Як запэўніў гледачоў-чытачоў новы галоўны рэдактар "першай беларускай газеты з рысункамі" **Андрэй Скурко,** сёлета плануецца выпусціць каля 15 кніг з гэтай серыі. У тым ліку "Лісты з лесу" **Паўла Севярынца**, "Сабачыя гісторыі" **Віктара Шніпа,** кнігі публіцыстыкі **Віталя Тараса, Алеся Кудрыцкага,** магчыма, нават дзіцячую "Плястыляндыю" **Алеся Кудрыцкага**.

Вечарына праходзіла ў надзіва вялікай зале, да таго ж перапоўненай прыхільнікамі. Андрэй Хадановіч скарыстаўся выпадкам і прэзентаваў не толькі свае "Сто лі100ў", але яшчэ шмат кніжак.

Выступаў на імпрэзе і гурт "Рэха", найбольш вядомы песняй "Чэ Гевара" з альбома "Песні Свабоды", да якой Хадановіч прыдумаў свой працяг з уласным тлумачэннем, хто ж такі Чэ Гевара. Як раптоўна высветлілася падчас вечарыны, Андрэя з гуртом "Рэха" яднае тое, што *"маленькая бубначка"* гурта і *"маленькая пісьменніца"* **Алена Хадановіч** маюць па 8 месяцаў ад нараджэння.

Запрошаны на вечарыну **Зміцер Вайцюшкевіч** заспяваў "Мірныя людзі" на словы Хадановіча, і ўсе адразу зразумелі, чаго трэба ад жыцця сярэднестатыстычнаму беларусу.

*"Калі не хапае слоў, Вайцюшкевіч пачынае танчыць, а Хадановіч — спяваць,* — слушна заўважыў **Максім Жбанкоў**. І Андрэй яшчэ раз гэта пацвердзіў, парадаваўшы "Песняй пра карысць адукацыі і сучасных сродкаў сувязі" і шчымлівай музычнай гісторыяй пра кепку (на матыў бітлоўскай "Girl"), якую лірычны герой згубіў, заглядзеўшыся на дзяўчыну.

У пэўныя моманты імпрэза ператваралася ў акцыю ведзьмакоў, якія намагаліся заваражыць снег, каб, нарэшце, прыйшла сапраўдная зіма. Спачатку **Уладзімір Арлоў** здзівіўся, што "ў гэтыя вясновыя студзеньскія дні Хадановіч папрасіў яго пачытаць што-небудзь *"марозна-каляднае"*. І Арлоў чытаў вершы пра свае чароўныя сны. А сняцца яму на Каляды, як вядома, выключна Архіварыус Война ды ўласна Хадановіч.

А пасля ў ролю варажбіта ўвайшоў Андрэй і стаў чытаць вершы пра снег, паведамляючы, што *"без снегу нават пейзажы робяцца ню"*, і заклікаючы *"падпісацца на снег"*. Калі ж ён разам з **Уладзем Лянкевічам** выканаў "Калядны рэп", сумневу ў тым, што зіма хутка прыйдзе, здаецца, ні ў кога не засталося. Відавочна, заклінанні паэтаў мелі плён, бо ў хуткім часе снег выпаў...

**Андрусь ЛЯСКО.**

КИНОВЕСТИ

## *Минчане любят «кино не для всех»*

**В 2006 году минские кинотеатры посетило 3 миллиона 600 тыся ч зрителей.**

В последнее время вырисовывается тенденция семейных походов в кино. Для родителей с детьми и бабушек-дедушек с внуками кинотеатр становится местом общения. Причем чаще всего семьями смотрят японские, американские и российские полнометражные анимационные фильмы, а также специальные программы для детей.

Кинопрокатчики отмечают возросший интерес молодых кинозрителей к *"фильмам не для всех"*, в частности, к новинкам Каннского международного кинофестиваля, показ которых устраивает Дом кино, программам "Феномены кино" в кинотеатре "Ракета" (классика советского кино), к различным кинопроектам в кинотеатре "Победа", который входит в Европейскую ассоциацию кинотеатров, а также к премьерам лучших российских фильмов в "Центральном".

Что касается ежедневного репертуара, то "Киновидеопрокат" Мингорисполкома стремится выпускать мировые кинопремьеры на экран одновременно с премьерами в Европе и Америке. Например, сейчас в минских кинотеатрах идет американский фильм "Престиж". Хотя гендиректор предприятия **Василий Коктыш** не скрывает, что от мировых тенденций минский кинопрокат все же отстает...

Какие фильмы составили пятерку самых посещаемых в 2006 году? На первом месте фантастический боевик *"Дневной дозор" (Россия)*. Его посмотрело 240 тысяч зрителей. На втором — приключенческий боевик *"Пираты Карибского моря-2: Сундук мертвеца" (США)* — 203 тысячи зрителей, на третьем — мистическая драма *"Парфюмер" (Германия—Франция—Испания)* — 150 тысяч, на четвертом — военная кинодрама *"Сволочи" (Россия)* — 83 тыс., на пятом — криминальная драма *"Бумер. Фильм второй" (Россия)* и мистико-приключенческий фильм *"Гарри Потер и Кубок Огня" (США)* — по 75 тысяч зрителей.

## *Грустный Андерсен*

Знаменитый комедиограф Эльдар Рязанов имел обыкновение в каждом фильме оставлять автограф — он во все фильмах оставлял для себя маленькую роль. А вот в *"Карнавальной ночи-2"*, недавно показанной по телевизору, он сыграл самого себя — режиссера "Карнавальной ночи-1" .

В финале своего же римейка, сидя в бутафорских камышах, Эльдар Александрович спел дуэтом с женой Эммой Абайдуллиной про то, *"как хочется милой наивной мелодии, чтоб сумасбродно душа колобродила"*. Похоже, этим фильмом патриарх советской (а ныне российской) комедии прощается с кино навсегда. Он поставил жирный восклицательный знак в творческой карьере, пройдясь сатирическим кинотесаком по таким явлениям российской действительности, как передел собственности криминальной братвой и продажность в сфере шоубизнеса. Подобно булгаковскому Воланду Рязанов посрамил алчность определенного сорта публики, воспроизведя эпизод из "Мастера и Маргариты" с дождем денежных купюр.

А на этой неделе в кинотеатре "Центральный" можно увидеть предпоследнюю картину Рязанова ***"Андерсен. Жизнь без любви"***. В ней больше грустного, чем зрелищного. Кинематографист выводит великого сказочника-датчанина из колонны детских повествователей, раскрывая его личную драму. Влияние творений Андерсена на человеческие души режиссер переводит в социально-психологическую плоскость, вводя в контекст фильма оккупацию Дании фашистами в сороковые годы минувшего века.

Возможно, зрители, которые будут искать

эксцентриаду и сплошные смешинки, разочаруется. Что ж, Рязанов разный, и каждый из зрителей выбирает, каким его любить.

В ноябре этого года мэтр отметит 80-летие. Недавно врученную ему премию "Триумф" можно считать итоговой за все творчество и первой в ряду последующих юбилейных наград. Теперь "Рязановиада" продолжится усилиями его коллег. С согласия самого создателя готовится к съемкам "Ирония судьбы-2".

## *Огни городской окраины по-фински*

Самый популярный финн у массового зрителя — актер **Вилле Хаапсало**, сыгравший в комедиях об особенностях национальной охоты, рыбалки и в трагикомедии "Кукушка". Самым же популярным финном в кинематографической среде называют режиссера, сценариста, продюсера **Аки Каурисмяки**. Он острый критик социальных пороков своей страны и защитник обездоленных — тех, кого причисляют к простым людям. Мыслит он парадоксально, что сказывается на содержании его картин, которые одновременно и пессимистичны, и оптимистичны.

***С 1 по 11 февраля*** столичный кинотеатр "Победа" представит коллекцию фильмов **Аки Каурисмяки**, которую презентует в Беларуси, Украине и России "Интерсинема XXI век" при поддержке Посольства Финляндии в России и Национального комитета по кинематографии Финляндии. В программу входит и последняя картина режиссера ***"Огни городской окраины"*** *(2006 год)*, которая завершает трилогию социальных драм "Плывущие облака" и "Человек без прошлого".

**Алла БОБКОВА, кинокритик.**

НОВЫЯ ІМЁНЫ

*Сяргей ЧУБ:*

# «Не магу жыць без добрага настрою...»

*Сяргей Чуб — адзін з самых маладых і запатрабаваных акцёраў Купалаўскага тэатра. Рэпарцёр "Народнай волі" вырашыла пазнаёміцца з ім крыху бліжэй...*

**— Давайце пачнем з "класічнага пытання": пра тэатральную кар'еру Вы, напэўна, марылі з дзяцінства?**

— Я заўжды браў удзел у школьных мерапрыемствах, у старэйшых класах нават часта выступаў рэжысёрам. Але разуменне таго, што я насамрэч мог бы іграць у тэатры, прыйшло напрыканцы 11-га класа. У Акадэмію мастацтваў набор заўжды праводзіцца раней, чым у іншыя ВНУ. Вельмі вялікі конкурс, жорсткі адбор, і каб не ламаць маладым людзям лёс, даецца магчымасць паспрабаваць і ў адмоўным выпадку паступіць пасля ў звычайны універсітэт на іншую спецыяльнасць. Я паспрабаваў. Пашанцавала. На здзіўленне, паступіў даволі лёгка. Але першы год быў цяжкаваты, бо я не разумеў, куды паступіў і навошта. І нават ішла размова пра адлічэнне: я амаль нічога не рабіў — проста сядзеў і аглядваўся. А пасля зразумеў, што гэта менавіта тое, што мне трэба.

**— Гэта, напэўна, вялікі гонар для маладых акцёраў — працаваць у Купалаўскім тэатры...**

— Наш курс набіраўся мастацкім кіраўніком Купалаўскага Валерыем Раеўскім. А ён ставіў мэту, каб максімальная колькасць студэнтаў прыйшла пасля ў тэатр. Некалькі год таму ў Купалаўскім не хапала моладзі — пра гэта нам і педагогі казалі. Таму курс у нас быў дастаткова вялікі — 16 чалавек, з іх дзевяць скончылі Акадэмію і шэсць іграе ў Купалаўскім тэатры. У 1998 годзе я паступіў, а ўжо ў 2000 годзе нас, студэнтаў, запрасілі на працу ў тэатр на палову стаўкі. І пасля зрабілі прыемную і прывабную прапанову — працаваць у беларускім тэатры №1. І ролі ў нас пачалі з'яўляцца дастаткова хутка. Нас не закінулі, мы занятыя практычна ў кожнай прэм'еры, і гэтая запатрабаванасць, канешне, радуе.

**— А як у Вас складваюцца стасункі з імянітымі калегамі?**

— У нас "купалаўская сям'я". І што датычыцца маладога пакалення, то мы шмат часу праводзім разам і па-за сцэнай. Да таго ж немагчыма ўвечары іграць на адной сцэне з чалавекам, з якім ты раніцай пасварыўся. Таму ў нас усе сяброўюць, часам, праўда, прымусова...

**— Ці можна пацікавіцца Вашым сямейным становішчам?**

— Не жанаты. Але ёсць сур'ёзныя планы на будучыню. І ёсць каханая дзяўчына Каця.

**— Яна нейкім чынам звязана з тэатрам ці з тэлебачаннем?**

— Не, у яе бацька працуе ў тэатры, таму яна шмат ведае пра тэатр, з дзяцінства часта хадзіла на спектаклі...

**— Якім Вы ўяўляеце ідэал сямейнага шчасця?**

— Пакуль што толькі ў агульных рысах. Пачуцці бываюць непастаяннымі. Мне здаецца, галоўнае ў сям'і — ўзаемапаразуменне і павага адзін да аднаго. Важна быць упэўненым, што побач не проста жонка, а чалавек, які дапаможа ў любой сітуацыі, нешта падкажа, параіць...

**— Ці ёсць рэчы, без якіх Вы не маглі б жыць?**

— Практычна ад усяго матэрыяльнага можна адмовіцца. Не змог бы адмовіцца ад сяброў. І яшчэ адно, без чаго я не змог бы жыць — добры настрой. На маю думку, гэта адзін са складальнікаў удачы.

**— Вы цікавіцеся палітыкай?**

— Тэатр і палітыка, на маю думку, не павінны быць звязанымі. Тэатр па сваёй сутнасці мусіць быць апалітычным. На сцэну выносяцца пэўныя сацыяльныя канфлікты. Я лічу, што мастацтва павінна радаваць людзей, а не навязваць палітычныя погляды...

**— Але ж ёсць меркаванне, што сярод акцёраў — шмат апазіцыянераў. У Чэхіі, напрыклад, падчас змены ўлады на пачатку 1990-х гадоў менавіта акцёры разам са студэнтамі складалі найбольш актыўную рэакцыйную частку грамадства...**

— Так, тэатр часта лічаць апазіцыяй. Але апазіцыю можна знайсці дзе заўгодна, сярод прадстаўнікоў любой прафесіі. І я не лічу, што яе трэба шукаць у тэатры.

**ДАСЬЕ**

*Сяргей Чуб нарадзіўся 4 кастрычніка 1980 года.*
*Працуе ў тэатры з 2002-га.*
*Яго можна ўбачыць у спектаклях "Паўлінка", "Каханне ў стылі барока", "Івона, прынцэса Бургундская", "Балада пра каханне", "Эрык XIV", "Сымон-музыка", і нават у адной з апошніх прэм'ер Купалаўскага — "Маэстра".*
*У побыце непераборлівы і "ўсядны".*
*Любіць адпачынак на прыродзе.*
*Лічыць актрыс Купалаўскага тэатра самымі прыгожымі.*

**— На Вашую думку, галоўная функцыя тэатра — забаўляць ці выхоўваць гледача?**

— Мяркую, гэта павінна сумяшчацца. Глядач мусіць выходзіць з тэатра змененым, крыху іншым. Мне падабаецца, што тэатр цяпер актуальны, запатрабаваны. Радуюць аплядысменты, вялікія чэргі ў касах... У нас амаль заўжды аншлагі. Прэм'еры карыстаюцца непадробнай цікавасцю...

**— Якія ролі Вам найцяжэй іграць, і ці суадносяцца характары Вашых герояў з Вашым характарам?**

— Што датычыцца майго характару, па знаку задыяка я — Шалі: чалавек настрою, і часам любая дробязь можа выбіць мяне з каляіі...

Не скажу, што мне не падабаюцца сур'ёзныя драматычныя ролі, напрыклад, у прэм'еры мінулага года "Балада пра каханне", хоць пасля такога спектакля бывае цяжка прыйсці ў сябе. Але калі роля з нейкай доляй гумару, то ўсё праходзіць лёгка, і я проста атрымліваю асалоду на сцэне...

**Вальжына КОРСАК.**
**Фота аўтара.**

АМБІЦЫІ

*Аляксандр САЛАДУХА:*

# «На канцэртах проста шок пасля нашай песні...»

*Прэзентацыя новага альбома Аляксандра Саладухі "Любить тебя, родная" адбылася ў дзень нараджэння спевака ў сталічнай краме "Музыка здесь".*

Падчас прэзентацыі нечакана спрацаваў сігнал пажарнай небяспекі. "Вось што значыць гарачыя хіты", — пажартаваў нехта з сяброў спевака...

Дыск, прысвечаны 20-годдзю творчай дзейнасці спевака, выпушчаны кампаніяй "VIGMA".

*"Менавіта яны выпусцілі мой пяты альбом "Сотни километров до любви" і першую пласцінку "Здравствуй, чужая милая". 17 студзеня 1996 года яе прэзентацыя адбылася ў Гандлёвым доме "На Нямізе"*, — настальгічна ўзгадаў спявак.

Здаецца, ён памятае ўсе даты запісу і выхаду сваіх песень, кліпаў, альбомаў і ахвотна іх агучвае...

А гаспадыня кампаніі "VIGMA" **Жанна Няхайчык** лічыць: *"Саша Саладуха — талісман нашай кампаніі, бо яшчэ на пачатку сваёй дзейнасці мы пачалі супрацоўнічаць з ім, і гэта быў наш першы ўдалы камерцыйны праект!"*

Што да песень, то ў альбом увайшлі цэлыя тры новыя кампазіцыі: "Позволь", "Тебе" і "Любить тебя родная". Астатняе — найлепшыя, на думку выканаўцы, песні ягоных *"дваццаці гадоў на прафесійнай сцэне"*.

Дарэчы, паважаныя чытачы, не падумайце, што я прапусціла коску ў назве альбома, ці што ў рэдакцыі блага працуе карэктар. Справа ў тым, што коскі насамрэч няма. Пачуўшы пытанне аб прычыне такога здарэння, Аляксандр разгубіўся і засумняваўся:

*"Ведаеце, я нават неяк не падумаў пра гэта... Вось у "Здравствуй, чужая милая" павінна была быць коска, а тут... Па-мойму, тут не трэба коску ставіць...*

Усе песні Аляксандра, па яго словах, адрасаваныя ягонай грамадзянскай жонцы Наталлі.

*"Яна мая адзіная муза"*, — прызнаецца спявак.

Аднак на канцэртах Аляксандр спявае не з жонкай (якая, дарэчы, таксама вельмі добра спявае), а з малавядомай спявачкай **Вольгай Драздовай.** Чаму менавіта з ёй, а не, напрыклад, з гуртом "Элемент", у якім спяваюць два 19-гадовыя сыны Саладухі?

*"Вольга Драздова — гэта тая адзіная спявачка, з кім я хацеў запісаць і запісаў дуэт,* — тлумачыць Саладуха. — *Гэта адзіная беларуская спявачка, якая і па знешніх, і па вакальных даных, і па фактуры адпавядае таму, што падабаецца мне. На канцэртах проста шок пасля нашай песні "Сотни километров до любви". Ну, як і пасля многіх іншых маіх песень...*"

*"Але 7 сакавіка ў Канцэртнай зале "Мінск" адбудзецца вялікі юбілейны канцэрт Аляксандра Саладухі з удзелам Вольгі Драздовай і гурта "Элемент"*, — чамусьці кажа пра сябе ў трэцяй асобе спявак.

На прэзентацыю новага альбома спявак запрасіў журналістаў і аўтараў ягоных песень — паэтаў і кампазітараў. Цікава, што сярод людзей даволі сталага ўзросту, з якімі Саладуха працуе ўжо 12 год, — напрыклад, кампазітар **Алег Елісеенкаў** — апынулася вельмі маладая паэтэса **Ніна Багданава**. Магчыма, яна не знаёмая вам як паэтэса, але можа быць вядомай як удзельніца гурта "Pin-code".

*"Усе цудоўна разумеюць, што і хто Аляксандр Саладуха для нашай эстрады — калі мы хадзілі пяшком пад стол, Саладуха збіраў стадыёны!* — з захапленнем гаворыць Ніна. — *І тое, што яму дагэтуль не далі званне заслужанага ці народнага артыста Беларусі, — неістотна. Усё адно, ён агульналюбімы спявак, і мы дазволілі сабе вольнасць — уручыць яму сваё званне народнага артыста ад творчай моладзі. Можа, гэта будзе штуршком, і хто-небудзь ужо нарэшце дадумаецца даць яму гэтае званне насамрэч!"*

Тым не менш пакуль што ніхто не дадумаўся...

Затое ў асабістым жыцці спевака ўсё выдатна. Паводле ягоных слоў, на пачатку студзеня пачалося будаўніцтва іх з Наталляй новага дома за горадам.

*"Калі будуць уваходзіны, усіх абавязкова запрашу"*, — паабяцаў Саладуха.

Напэўна, на ўсе гэтыя мерапрыемствы Саладуха запросіць яшчэ аднаго чалавека. Свайго самага шчырага і сапраўднага прыхільніка. Валодзя працуе медбратам у адной з мінскіх клінік і спявае ўвесь рэпертуар Саладухі на аглядах мастацкай самадзейнасці і нават займае першыя месцы. Напэўна, гэта вельмі сімвалічна, бо Аляксандр Саладуха — у мінулым таксама медык.

**Вальжына КОРСАК.**

АСОБА

## *След на зямлі*

**Нацыянальны мастацкі музей Беларусі адсвяткаваў 75-я ўгодкі народзін Юрыя Аляксандравіча Карачуна (1931—1997), які з 1977 года і да скону быў дырэктарам музея. Юбілей адзначылі выставай твораў юбіляра, навуковымі чытаннямі і выданнем кнігі пра ягоныя жыццё і творчасць "Пакінуць свой след на зямлі..."**

Нарадзіўся Юрый Аляксандравіч у Мінску, але дзяцінства правёў удалечыні ад радзімы. Бо ягонага бацьку, паэта і публіцыста, рэпрэсавалі — саслалі ў Краснаярскі край. Юрый паехаў з ім. Вярнуўся дадому ў 1947 годзе. Вучыўся ў Мінскай мастацкай вучэльні, Маскоўскім паліграфічным інстытуце, працаваў мастацкім рэдактарам выдавецтва. З 1966 года ягоныя творчыя работы экспануюцца на рэспубліканскіх выставах.

Да Юрыя Карачуна дырэктарам Дзяржаўнага мастацкага музея БССР была Алена Васільеўна Аладава. Менавіта яна, сыходзячы на пенсію, парэкамендавала яго на гэтую пасаду. Прычым Алена Васільеўна прыклала шмат намаганняў, каб угаварыць самога Юрыя Аляксандравіча згадзіцца стаць дырэктарам. Для Карачуна перадусім была творчасць, і ён разумеў, што на такой адказнай пасадзе творчасцю давядзецца ахвяраваць. Але Аладава націснула на ўласцівае Юрыю Аляксандравічу пачуццё адказнасці і намалявала такую выразную карціну заняпаду ў музеі, калі пасаду зойме хто іншы, што Карачун мусіў пагадзіцца.

Як паказалі наступныя падзеі, Алена Васільеўна зрабіла правільны выбар. Тыя, хто працаваў з Карачуном, на яго хіба што не моляцца, называюць ягонае дырэктарства рэнесансам, эпохай адраджэння. Пры ім музей пашырыў сетку філіялаў, значна павялічыў калекцыю сучаснага беларускага мастацтва, усталяваў міжнародныя сувязі. Пры ім пачалі ўзводзіць прыбудову да галоўнага корпуса музея. І, нарэшце, менавіта падчас дырэктарства Юрыя Карачуна Дзяржаўны мастацкі музей павысіў свой статус. Стаў Нацыянальным музеем.

Як журналісту мне давялося асвятляць імпрэзы ў галоўным мастацкім музеі краіны і, адпаведна, сустракацца з Юрыем Аляксандравічам. Згадваю, што гэты добразычлівы чалавек заўжды лічыў сваім абавязкам асабіста падзякаваць журналістам за публікацыі, карысныя для справы прапаганды культуры і асвятлення праблем музея. Асабліва, калі ў публікацыях гаворка ішла пра рэчы, якія, на ягоную думку, трэба было абавязкова давесці да грамадства, але сам ён як чыноўнік не меў права агалошваць "службовую тайну".

У дзень нараджэння Юрыя Карачуна ля яго бронзавага бюста, што стаіць у фае музея, заўжды ляжаць кветкі.

**Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.**

25 СТУДЗЕНЯ — ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ УЛАДЗІМІРА ВЫСОЦКАГА

# Марына Уладзі не хацела пакідаць Навагрудчыну...

*(Успаміны пра «зорную пару»)*

Знакаміты іспанскі мысляр Бальтасар Грасіян у сваім "Кішэнным аракуле" пісаў: "Нават людзі рэдкіх вартасцяў залежаць ад свайго часу. Не ўсім суджаны быў той час, якога яны вартыя; многія, каму ён дастаўся, не здолелі яго скарыць".

Уладзімір Высоцкі... Вось ужо больш за два дзесяцігоддзі, як ён пакінуў гэты свет, але яго імя і дагэтуль свеціцца непагаснай зоркай на музычна-тэатральным небасхіле. Ён жыве ў песнях, кінафільмах, людской памяці. У 70—80-х гадах мінулага стагоддзя на абшарах Савецкага Саюза цяжка было знайсці чалавека, які б не захапляўся ягонымі песнямі. Высоцкі быў не проста паэт, спявак, акцёр — ён быў фенаменам, унікальнай з'явай. Ні да яго, ні пасля яго няма асобы, у якой так гарманічна спалучыліся б паэтычны, акцёрскі і музычны талент. Ён напісаў звыш шасцісот песень. Практычна няма сферы жыцця, якую б паэт не закрануў у сваёй творчасці. Яго песні гучаць больш як у трыццаці кінафільмах. Як акцёр ён зняўся больш як у дваццаці фільмах, а яшчэ, акрамя таго, былі ролі ў спектаклях славутай "Таганкі". Энергетычны патэнцыял Высоцкага быў настолькі моцны, што ён пры іншым збегу жыццёвых абставін мог бы быць і лётчыкам, і альпіністам, і мараком. Але паколькі жыццё немагчыма пражыць двойчы ці тройчы, то кампенсацыяй за гэтыя нерэалізаваныя магчымасці стала для яго "пражыванне" другога жыцця ў песнях, на сцэне, на экране.

У 1969 годзе, падчас здымкаў фільма Віктара Турава "Сыны ідуць у бой", Высоцкі прыязджаў на Навагрудчыну. Яго задачай было агучыць сваімі песнямі гэты фільм. Якім застаўся спявак у памяці навагрудчан? Пра гэта ўспамінаюць жыхары горада Георгій Яўстафавіч Бака і Анатоль Сямёнавіч Шахрай.

Прыблізна ў чатырох кіламетрах ад Навагрудка, сярод ялін і бяроз, раскінулася невялікае азярцо з прыгожай назвай Літоўка. Менавіта тут, паблізу возера, стаіць баць-коўская хата Георгія Яўстафавіча, у якой і спыняўся Уладзімір Высоцкі. "Помніцца, Высоцкі з'явіўся на нашым падворку неяк нечакана і, прывітаўшыся, сказаў: "Я — Высоцкі", — распавядае Георгій Яўстафавіч, — а пасля дастаў з кішэні пасведчанне і прадставіў яго. Для мяне гэта было нейкай нечаканасцю, бо само па сабе яго прозвішча асацыіравалася ў свядомасці са статным, высокім чалавекам. Тым больш, вядомы па песнях яго моцны, з хрыпатой голас таксама ствараў вобраз шыракаплечага мужчыны. А тут стаяў хударлявы, невысокі малады чалавек. На ім была кепка і чорная куртачка. Ён не патрабаваў для сябе ніякіх асабістых умоў, прывілегій. Быў вельмі просты ў размове. Нягледзячы на тое, што ў яго песнях сустракаецца своеасаблівы, нават блатны жаргон, у рэальным жыцці ён карыстаўся звычайнай мовай. Кажуць, што той перыяд быў далёка не лепшым у жыцці спевака. Гэта было бачна нават вонкава. Але калі да яго прыехала Марына Уладзі, ён нібыта пасвятлеў і ажыў. Марына ў той час прыехала па запрашэнні ў Маскву, але, калі даведалася, што Уладзімір у Беларусі, села на цягнік і наўпрост накіравалася ў Ліду, а пасля ў Навагрудак. І вось з гэтай пары яны практычна ўсюды былі ўдваіх, шчаслівыя ад сваёй сустрэчы. Марына спакойна дзяліла з Высоцкім сціплы вясковы побыт. Добра гаварыла па-руску. Капрызнай фанабэрыстасці за ёй ніхто не заўважаў. Нічым асаблівым ні Высоцкі, ні Уладзі не вылучаліся. Дарэчы, нават спалі на сене, як звычайныя вяскоўцы".

А вось Анатолю Сямёнавічу Шахраю давялося сустракацца з Уладзімірам Высоцкім не толькі падчас здымкаў фільма "Сыны ідуць у бой", але і фільма "Вайна пад стрэхамі". У той час Анатоль Сямёнавіч працаваў якраз на кінастудыі "Беларусьфільм" вадзіцелем здымачных іграві ых машын — дубліраваў ролі акцёраў, якія самі не маглі кіраваць машынамі, ці выконваў складаныя віражы, напрыклад, на горных дарогах. "Упершыню я ўбачыў Высоцкага на "Беларусьфільме". Ох, як даўно гэта было! — успамінае Анатоль Сямёнавіч. — Помню, як ён іграў на гітары і спяваў. Ды і наогул, з гітарай ён, можна сказаць, не развітваўся. Бледны, худы, але адкуль у яго браліся сілы — проста незразумела. Мне ён запомніўся стрыманым, неагаваркім. У Браславе, калі здымалі фільм "Вайна пад стрэхамі", Высоцкага некалькі разоў забіралі супрацоўнікі КДБ, і здымкі перапыняліся, а потым ён зноў з'яўляўся і работа працягвалася". Я, па наіўнасці, запытала ў Анатоля Сямёнавіча: "За што? За сваркі, за бойкі?" "Ды не, зусім не, — адказаў мой суразмоўца. — Проста за песні". Запісы яго песень ануліравалі. Што датычыцца сварак ці нейкіх канфліктаў, дык іх практычна не было. Па-першае, сам Віктар Тураў быў простым і лагодным чалавекам. У Высоцкага таксама не было празмернай ганарлівасці...

Здымалі фільм летам. Не ведаю, ці добра плаваў Высоцкі, але што ён падоўгу купаўся на Браслаўскіх азёрах — гэта чамусьці запомнілася. Падчас здымкаў фільма "Сыны ідуць у бой" было больш спакойна. Такіх знікненняў спевака не было. Усе мы жылі адной сям'ёй — не зважалі, хто тэхнічны работнік, а хто — акцёр. Дарэчы, калі ў Мінск прыязджаў на здымкі Алег Янкоўскі, дык адразу паміж ім і іншымі ўсталёўвалася пэўная дыстанцыя.

Канешне, Высоцкі быў вельмі таленавіты. Яго часта можна было ўбачыць задуменным — здавалася, што ён увесь час нешта стварае ў сваёй галаве. Ніколі не было чуваць, каб ён на каго-небудзь павышаў голас ці злаваўся, або з кагосьці кпіў. Што датычыцца стасункаў паміж людзьмі, то тут, на Літоўцы, падчас здымкаў, ён часцей за ўсё кантактаваў з рэжысёрам Віктарам Туравым. Гэта былі і проста чалавечыя размовы, і па творчых пытаннях. Прыезд жа сюды Марыны Уладзі акрыліў Высоцкага, даў яму духоўнай моцы і, напэўна, натхнення. Якім ён запомніўся найбольш? Вельмі добра памятаю, як ён сядзеў каля возера на камені, у сарочцы з закаканымі рукавамі і спяваў. Дарэчы, так ён найчасцей апранаўся, але калі было халаднавата, хадзіў у пінжаку".

Уладзімір Высоцкі нарадзіўся ў халодны зімовы дзень, 25 студзеня, і сваімі песнямі ён сагураваў душы тысяч людзей. І як тут яшчэ раз не згадаць мысляра Грасіяна, які казаў, што ёсць чалавечы розум, падобны на вочы рысі, які нібы выпраменьвае святло; і чым гусцей цемра, тым святло ярчэй. Гэтыя словы цалкам адпавядаюць асобе Уладзіміра Высоцкага.

Так, паэт заўсёды ведаў сабе цану. Нездарма ён пісаў:

*Не надо подходить*
*к чужим столам*
*И отзываться,*
*если окликают.*

Уладзіміру Высоцкаму давялося жыць у няпросты час. А Марына зараз жыве ў прыгарадзе Парыжа і, магчыма, успамінаючы Уладзіміра Высоцкага, з цеплынёй узгадвае Навагрудчыну. Бо вядома з успамінаў Алеся Адамовіча, што Марына прасіла Віктара Турава ўгаварыць Валодзю застацца тут яшчэ на некалькі дзён.

**Святлана АБДУЛАЕВА,**
**выкладчык Навагрудскай школы мастацтваў.**

ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ, ШТО...

## *Не ўпершыню зімой сады квітнеюць*

Куды ні пайдзі — размовы пра незвычайна цёплую зіму. Сіноптыкі ўжо заявілі, што тэмпература снежня аказалася на 6,8 градуса вышэй за норму. Падобна на тое, што тэмпературнымі рэкордамі скончыцца і студзень. Але ці так гэта ўсё незвычайна?

Невядомы полацкі летапісец адзначаў, што ў 1349 годзе таксама была цёплая і сырая зіма.

У студзені і лютым 1424 года, згодна з гістарычным дакументам, квітнелі сады і распускаліся фіялкі. Яшчэ больш цёпла было зімой 1493 года. Як адзначалі летапісцы, "зима през все дни стычня (января) и лютого (февраля) такая теплая была, аж сады квитнули, травы были великие, рели (луга) и сеножати зеленилися". Праўда, 15 сакавіка здарыўся вельмі моцны мароз і ўсё загінула.

Па даных Беларускага геаграфічнага таварыства, мяккія зімы былі і ў канцы XVI стагоддзя. Напрыклад, у 1588 годзе ў Еўропе зімой таксама пачалі квітнець сады. А ў Беларусі тым годам з 18 студзеня пачалі выганяць кароў і іншую хатнюю жывёлу на пашу. Праўда, зноў-такі, у лютым пачаліся моцныя маразы.

Баркулабаўскі летапіс адзначаў своеасаблівасць 1959 года, як "ні зіма, ні лета, ні восень, ні вясна, аж да месяца мая, да Святога Афанасія снегу не было ў Літве".

Так што, калі вам кажуць, што "за ўсю гісторыю метэанагляду такога не назіралася", трэба мець на ўвазе, што гэты самы метэанагляд пачаўся толькі ў 1880 годзе. Для гісторыі гэта зусім нішто.

**Іна ФРАЛОВА.**

*г.Мінск.*

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

# Не застаньцеся ў лютым без «Народнай волі»

У адным з папярэдніх нумароў мы звярталі ўвагу на тое, што з-за фінансавых цяжкасцяў некаторыя чытачы зрабілі **перадаплату** толькі за студзеньскія нумары. Каб і ў лютым мець пад рукамі сваю любімую газету, Вам, шаноўныя, трэба ўсё ж у самыя бліжэйшыя дні знайсці сродкі і па-новаму аформіць **перадаплату.** Дзеля гэтага мы і друкуем сёння ўзоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Каб зрабіць **перадаплату** за лютаўскія і сакавіцкія нумары (а можна адразу і за нумары ўсяго паўгоддзя), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры з новымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за два месяцы адпаведна 19.000 і 30.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

**УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.**

У чарговы раз звяртаем увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі.

Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

**Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!**

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть) | | | | |
| Плательщик | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть) | | | | |
| Плательщик | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

**Абонентская карточка**
*на номера газеты «Народная воля»*
**за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2007 года**
*(ненужное зачеркнуть)*
*Заполняется отчетливо печатными буквами и обязательно отправляется в редакцию с копией платежного документа*

**фамилия**
**имя** **отч.**
**индекс почтового отделения**
**область**
**район**
**название населенного пункта**
*город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)*
**улица пр-т переулок** *(нужное — подчеркнуть)*
**дом** *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

*(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)*

СКАЖЫ, ВІТАЛЬ...

## Ці змянілася крымінальнае заканадаўства?

*Не падкажаце, ці не змянілася крымінальнае заканадаўства. Быццам бы зараз плануецца пакінуць толькі два рэжымы ўтрымання зняволеных — агульны і строгі. А яшчэ быццам бы плануецца паменшыць 25 гадоў пазбаўлення волі да 15. Калі гэта так, то павінен адбыцца перагляд шматлікіх крымінальных спраў?*

**К.Стацюк, г.Мінск.**

— Ваша інфармацыя недакладная. Ніякіх змяненняў тэрмінаў зняволення і змены рэжымаў утрымання зняволеных не будзе. Па меншай меры на сённяшні дзень такіх змяненняў, як у дзеючым заканадаўстве, так і ў законапраектах, няма.

## Шанцы трапіць у Расію — ёсць

*Я заканчваю вышэйшую навучальную ўстанову ў бягучым годзе. Далей хачу паступаць у аспірантуру на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі. Ці могуць мяне забраць у армію? Ці магу я не адпрацоўваць два гады па размеркаванні на тэрыторыі Беларусі? Справа ў тым, што жонка вучыцца ў той аспірантуры, куды хачу паступіць я.*

**Віктар Сцяпанаў, г.Гомель.**

— Згодна з Пастановай Савета міністраў Рэспублікі Беларусь аб размеркаванні выпускнікоў устаноў адукацыі, якія атрымалі прафесіянальна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную або вышэйшую адукацыю на дзённай форме навучання за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, "час службы ва Узброеных сілах Рэспублікі Беларусь, іншых войсках і воінскіх фарміраваннях Рэспублікі Беларусь пасля заканчэння ўстановы адукацыі залічваецца ў тэрмін абавязковай работы маладога спецыяліста па накіраванні".

Калі адзін з выпускнікоў — муж альбо жонка былі размеркаваны раней, то і другому праца павінна быць прадастаўлена ў тым жа населеным пункце. Але ў вашым выпадку жонка знаходзіцца ў іншай дзяржаве і таму ваша накіраванне залежыць ад рашэння камісіі па размеркаванні.

## Ці мелі права мяне абшукаць?

*Нядаўна мяне спыніў патрульны паставы і абшукаў сумку без усялякіх тлумачэнняў. Ці меў ён на гэта права?*

**Васіль Каравай, г.Гомель.**

— Падобнае можа адбыцца, калі чалавек здзейсніў адміністрацыйнае правапарушэнне і на яго збіраюцца скласці адміністрацыйны пратакол, а даведацца, хто ён такі, няма магчымасці (напрыклад, затрыманы знаходзіцца ў нецвярозым стане альбо не хоча гаварыць). У такіх выпадках дапускаецца дагляд рэчаў, які ўсё ж не варта блытаць з вобыскам. Вобыск праводзіцца з санкцыі пракурора з удзелам панятых, прычым толькі тады, калі ёсць даныя, што ў чалавека могуць знаходзіцца зброя, дакументы і каштоўнасці, якія маюць значэнне для крымінальнай справы. Асабісты вобыск без санкцыі пракурора магчымы толькі пры затрыманні асобы, якая падазраецца ў здзяйсненні злачынства альбо пры заключэнні чалавека пад варту. Супрацоўнік, які праводзіў вобыск, абавязаны скласці адпаведны пратакол, копія якога пад распіску павінна быць выдадзена і вам.

## Дарагая мая «Сталіца»...

*Як вядома, у падземным пераходзе на плошчы Незалежнасці месціцца грамадска-гандлёвы цэнтр "Сталіца". Мяне ён уразіў сваім размахам. Але хто яго будаваў? Ці не падкажаце Вы, у колькі абышлося гэтае будаўніцтва?*

*Святлана Вашчанка, г.Маладзечна.*

— Будаўніцтва мінскага падземнага гандлёвага цэнтра "Сталіца" абышлося ў 97 мільярдаў рублёў. Будаўніцтва вялося ў асноўным пад крэдыты АСБ "Беларусбанк", і ўжо 3 сакавіка ўпраўленне спажывецкага рынку павінна пачаць выплату працэнтаў і пагашэнне запазыкі па крэдыце. Цалкам крэдыт павінен быць вернуты да 2016 года.

Дарэчы, у бюджэце горада на гэтую "будоўлю веку" таксама была ўзята пазыка ў 11 мільярдаў рублёў.

Ці будзе праект мець камерцыйны поспех, пакуль сказаць вельмі цяжка, бо на сённяшні дзень тут у арэнду здадзена толькі 67 працэнтаў памяшканняў. Усяго ў "Сталіцы" пабудавана 66 памяшканняў пад аб'екты гандлю, паслуг, грамадскага харчавання, а таксама забаўляльны цэнтр, гаспадароў знайшлі пакуль толькі 55 памяшканняў. У цэнтры адкрыты фірмовыя крамы Мінскага завода ігрыстых він, завода "Крышталь", прадпрыемстваў "Белвест", "Элема" і іншых". Рыхтуюцца да адкрыцця крамы кандытарскіх фабрык "Спартак" і "Камунарка". Агульная плошча гандлёвага цэнтра "Сталіца" складае 47 тысяч квадратных метраў. Стаўка арэндная платы тут ад 30 еўра ў месяц для прадпрыемстваў рознічнага гандлю і да 150 еўра для банкаў і забаўляльнага цэнтра. Гэтыя паказчыкі, дарэчы, меншыя, чым у такіх гандлёвых цэнтрах, як "Еўропа" і "Паркінг".

***Свае пытанні ў рубрыку дасылайце на адрас: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а, рэдакцыя газеты "Народная воля" з пометкай "Скажы, Віталь...".***

**Вядучы рубрыкі Віталь ГАРБУЗАЎ.**

ЧАСТНЫЕ ОБЪЯВЛЕНИЯ

В суд Заводского района г.Минска поступило заявление о признании **ИВАНОВА Юрия Кузьмича**, 12 апреля 1957 года рождения, уроженца д.Плещевка Дедовичского района Псковской обл., последнее место жительства г.Минск, ул.Илимская 29-379 безвестно отсутствующим. Просьба ко всем гражданским и юридическим лицам, имеющим сведения об Иванове Юрии Кузьмиче, сообщить их суду в течение двух месяцев с момента публикации.

**Адрас рэдакцыі:**
**220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.**
**Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.**
**Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.**
**E-mail : nv@promedia.by**
**http://www.nv-online.info**
**Індэкс 63222**

**Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ**

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. По заказу ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 24.01.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №